PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 17 (2450) Год XLVIII | Беласток, 27 красавіка 2003 г. | Цана 2,00 зл.

Адыход рупліўца

14 красавіка 2003 г. у ЗША памерла Зора Кіпель (дзявочае прозвішча: Савёнак). Святой памяці Зора Кіпель нарадзілася ў 1927 г. у Мінску, дзе пад нямецкай акупацыяй закончыла пачатковую школу і вучылася ў Беларускай настаўніцкай семінарыі. У 1944 г., як дзесяткі тысяч іншых беларусаў, якія не хацелі зноў апынуцца пад саветамі, яна пакінула Беларусь і пераехала у Нямеччыну. У 1948 г. закончыла Беларускую гімназію ў Баварыі, а ў 1955 годзе атрымала дыплом магістра хіміі на Лювенскім універсітэце ў Бельгіі. У тым самым годзе эміграваала ў ЗША, дзе неўзабаве пабралася шлюбам з Вітаўтам Кіпелем, сябрам з Беларускай гімназіі і Лювенскага універсітэта. У іх нарадзілася двое дзяцей: Юрка і Алеся.

У 1966 г., пасля заканчэння бібліятэчнага факультэта Ратгерскага універсітэта ў штаце Нью-Джэрсі, дзе Зора і Вітаўт Кіпелі пасяліліся, яна стала працаваць у Нью-йоркскай публічнай бібліятэцы. У 1982 годзе стала намеснікам славянскага аддзела бібліятэкі, у 1991 г. выйшла на пенсію. У міжчасе закончыла факультэт параўнаўчай літаратуры Ратгерскага універсітэта, чаго непасрэдным вынікам была публікацыя ейнага ангельскага перакладу старабеларускай версіі „Аповесці аб Трышчане". Разам са сваім мужам Зора Кіпель сталася асноўнай інтэлектуальнай апорай беларускай дыяспары ў Амерыцы і ўвогуле ў свеце. Была аўтарам і рэдактарам шматлікіх артыкулаў і шэрагу кніжак, з якіх варта згадаць хоць тры: „Даведнік пра этнічныя групы штату Нью Джэрзі", „Бібліяграфія Янкі Купалы й Якуба Коласа на Захадзе" і „Byelorussian Statehood" (дзве апошнія ў супрацоўніцтве з мужам).

Я меў шчасце і гонар пазнаёміцца са спадарыняй Зорай асабіста, у 1991 годзе, калі ў ЗША збіраў матэрыялы і рыхтаваў кніжку пра Беларускую гімназію ў Баварыі. Як шмат іншых, хто яе ведаў асабіста, я быў глыбока ўражаны ейнай вялікай эрудыцыяй і зычлівасцю да людзей і свету. Спадарыня Зора выпраменьвала такую асаблівую далікатнасць і абыходлівасць у адносінах з іншымі, якую сёння сустракаецца надзвычай рэдка. Для мяне ейная смерць абазначае не толькі адыход вялікага рупліўца беларускай культуры і навукі, але адначасова і канец пэўнай эпохі ў летапісе беларускай эміграцыі, якая падалася на чужыну са спадзевам хутка вярнуцца назад на Бацькаўшчыну, але засталася там, за акіянам, назаўжды. Светлая памяць Вам, спадарыня Зора.

Ян Максімюк (Прага, Чэхія)

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Лічу сябе беларускай

Размова з Эвелінай ПЛІС з Шастакова, вучаніцай трэцяга класа Гімназіі ў Чыжах.

— Ты закончыла вучобу ў мінулым годзе з шасцёркамі па ўсіх прадметах, заняла другое месца ў конкурсе па беларускай мове ў Падляшскім ваяводстве і пятае месца ў нашым ваяводстве ў матэматычным конкурсе „Кангур". Ці апрача вучобы знаходзіш час на іншыя заняткі?

— Вучоба займае многа часу. Аднак, я люблю чытаць. Чытаю кніжкі звязаныя з канкрэтнымі прадметамі і іншыя творы, якія мяне цікавяць. Люблю чытаць па-беларуску. Гуляю з камп'ютэрам і памагаю бацькам у гаспадарцы, бо не хачу жыць толькі на іх кошт.

— Адкуль зацікаўленне беларускімі кніжкамі?

— Я лічу сябе беларускай. Люблю чытаць па-беларуску, бо гэта ж мая родная мова.

— Зараз штораз больш моладзі з беларускіх сем'яў лічыць сябе палякамі. Што мела ўплыў на фарміраванне тваёй нацыянальнай свядомасці?

— Мая сям'я, у якой мы гаворым на беларускім дыялекце, родная вёска Шастакова, дзе таксама часта гавару з сябрамі па-свойму, школа з прадметам беларускай мовы і конкурсы арганізаваныя па гэтым прадмеце.

— Якія конкурсы маеш на ўвазе?

— У падставовай школе прымала я ўдзел у дэкламатарскіх конкурсах беларускай мовы, пасля ўдзельнічала ў конкурсе беларускай гавэнды арганізаваным у Гайнаўскім беларускім ліцэі і нават два разы займала ў ім трэцяе месца. Апошнім часам удзельнічала я ў конкурсе беларускай мовы. Рыхтуючыся да конкурсаў, знаёмілася я з беларускай літаратурай і беларускімі пісьменнікамі, пра якіх раней не чула.

— Ты назвала прадмет беларускай мовы.

— На ўроках беларускай мовы многа не патрабуюць і мы ахвотна на іх ходзім. Можна там пазнаёміцца з беларускімі справамі.

— Ці твае школьныя сябры таксама лічаць сябе беларусамі?

— Большасць моладзі, якая вучыцца ў нашай школе, гэта беларусы. Аднак, не ўсе перакананыя ў гэтым. Некаторыя вучні лічаць сябе палякамі толькі таму, што жывуць у Польшчы. Некаторыя бацькі размаўляюць між сабою па-свойму, а да дзяцей гавораць па-польску. Гэтыя дзеці нават і не ўмеюць гаварыць на беларускай гаворцы, што з'яўляецца штучнай з'явай.

— Артыкулы, у якіх ты апісвала сваю школу і яе наваколле друкаваліся ў „Ніве". Ці нехта заахвоціў цябе напісаць у наш тыднёвік?

— Ужо добра не памятаю, але мне здаецца, што настаўніца беларускай мовы. Пасля ўжо самой хацелася пісаць.

— Апошнім часам твая карэспандэнцыя ў „Ніву" спынілася.

— На працягу мінулага года мы пачалі выдаваць у школе сваю газетку, у якой я з'яўляюся галоўным рэдактарам.

— Якія тэмы закранаеце ў часопісе?

— У галоўным пішам пра сваю школу і мерапрыемствы, якія ў ёй адбываюцца. Спачатку было многа ахвотных вучняў да пісання артыкулаў, але пасля стала цяжэй. Трэба некаторым напамінаць, каб пісалі тэксты.

— Ці змяшчаеце тэкст на беларускай мове?

— Я запрапанавала, каб зрабіць беларускамоўную частку газеты і пачалі мы рэалізаваць гэтую задуму.

— У гэтым школьным годзе ты прыступіла да прадметных конкурсаў па беларускай, рускай і польскай мовах, па гісторыі і матэматыцы. Якія рэзультаты?

[працяг ☞ 2]

Спакойнага і радаснага Велікоднага святкавання ўсім чытачам жадае рэдакцыя „Нівы"

Вялікае дзякуй ☞ 3

Людзі многа памаглі. Суседзі з Козлікаў і суседніх вёсак. І калектыў з Козлікаў, і беластоцкі калектыў, і беларускае таварыства, і „Ніва". І беларускі ліцэй у Бельску, і бацюшка Сасна. Адзін сусед з вёскі дзвесце злотаў даў, і нават з Сідры адзін пан сто злотаў прыслаў. Пры такой бядзе то кожная залатоўка дарагая.

У Іраку будуюць дарогі ☞ 4

Яшчэ падалі бомбы, гучалі выстралы, а „дэмакратычны і прагрэсіўны" свет пачаў разважаць пра адбудову Ірака. Вялікі брат з-за акіяна вызначыў на дапаможнікаў у „адбудове" толькі найбольш адданых яму саюзнікаў. Палічылі нават, што кошт вайны абышоўся сумай каля 40 мільярдаў долараў, але ў распараджэнні „вызваліцеляў" апынуліся залежы нафты вартыя 8,5 більёна долараў.

Пра тое ды сёе ☞ 4

Падмацаваўся я, гледзячы тэлевізійную праграму *Szansa na sukces*. Вось сярод маладых (і не толькі) выканаўцаў, якія прэзентавалі песні гурту „Vox" паявіўся беларус, Генадзь Лоска. Эміграваў ён са свае краіны, каб канчаткова пасяліцца ў Кракаве. Генадзь паразіў голасам — ахрыплым, рокавым. У Кракаве, апроч Алёшы Аўдзеева, будзе другая зорка з-за ўсходняй польскай мяжы.

Датчане ў Шлезвіг-Гольштэйне ☞ 5

Сёння сітуацыя датчан са Шлезвіг-Гольштэйна лічыцца еўрапейскай мадэллю ў галіне аховы правоў нацыянальных меншасцей. Спецыялісты жартуюць, што тут паспрыяў прускі дух пашаны для закону. Свой юрыдычны статус дацкая меншасць акрэсліла ўжо ў 1947 годзе, дарэчы, пры дапамозе брытанцаў, якія акупіравалі іх тэрыторыю.

Хрыстос уваскрос ☞ 9

Галоўная велікодная ўрачыстасць пачынаецца роўна ў поўнач з суботы на нядзелю. Перад плашчаніцай, якая знаходзіцца пасярэдзіне храма, правіцца ютрань, якую называюць іерусалімскай. Вернікі ўпоцемку смуткуюць аб Хрыстовых пакутах; паўторнае прышэсце Хрыста мае наступіць менавіта ў пасхальную ноч.

Беларусь — беларусы

Беларускія праблемы ААН

Колькі краін існуе на свеце і практычна ўсе прадстаўленыя ў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Створаная пасля другой сусветнай вайны ААН доўгі час была структурай, куды ўваходзілі дзяржавы з самымі рознымі, а дакладней супрацьлеглымі поглядамі на развіццё як іх саміх, так і навакольнага свету.

Няма сумнення, на працягу папярэдняга паўстагоддзя ААН адыграла немалую ролю ў залагодненні канфліктаў, у першую чаргу, паміж СССР і ЗША, як вядучымі дзяржавамі супрацьстаячых сістэм — сацыялістычнай і капіталістычнай. Наколькі добра ўсё гэта ўдавалася, напэўна, застанецца для ацэнкі, якую дадуць наступныя пакаленні. Тым не менш, на сёння бачна, што ў дзейнасці ААН наспеў даволі сур'ёзны крызіс. І выявіўся ён апошняй вайной у Іраку.

З любога крызісу маюць быць два выхады — альбо арганізацыя, зрабіўшы ў сабе пэўныя пераўтварэнні, узмоцніцца, альбо сыдзе ў гісторыю, як ужо не выконваючая свае функцыі ў сучаснасці. Некаторыя апошнія падзеі ў яе структурах паказваюць, што арганізацыя мае шанц выжыць як палітычнае аб'яднанне народаў і не пераўтварыцца ў штосьці гуманітарна-дабрачынна-бяззубае.

З сярэдзіны красавіка ў Камісіі ААН па правах чалавека ўпершыню ў гісторыі пачаўся разгляд сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі. Пікантнасць становішча ў тым, што беларускія ўлады апошнім часам, крытыкуючы ЗША за няўзгодненыя з ААН дзеянні ў Іраку, выстаўлялі сябе як барацьбітоў за міжнароднае права. Але як аказалася, пясчынку ў воку бліжняга заўважыць лягчэй, чым бервяно ва ўласным.

Адпаведны праект рэзалюцыі падрыхтаваны ўжо згаданымі ЗША, а таксама Балгарыяй, Венгрыяй, Чэхіяй, Славакіяй, Польшчай і Латвіяй пераданы на разгляд Камісіі. У праекце між іншага ўтрымліваюцца зважанні на тое, што Беларусь, якая з'яўляецца ўдзельнікам шмат якіх міжнародных дакументаў па абароне правоў чалавека, мусіць іх дакладна выконваць. Аднак гэтага якраз і не адбываецца. Незразумелыя знікненні апанентаў правячага рэжыму, незаконныя арышты і затрыманні, пераслед дзейнасці няўрадавых арганізацый і апазіцыйных партый штурхае да адпаведнага прыцягнення ўвагі, перш за ўсё, самога беларускага ўрада. У праекце рэзалюцыі да яго скіраваны настойлівы заклік звольніць альбо часова адхіліць ад займаемай пасады прадстаўнікоў праваахоўчых органаў, якія маюць дачыненне да выпадкаў знікнення і (альбо) смерці, да правядзення належнага расследавання гэтых выпадкаў. Таксама мусяць быць прыведзеныя ў адпаведнасць з Міжнародным пактам аб грамадзянскіх і палітычных правах дзеянні сіл правапарадку і службаў бяспекі. Павінна быць забяспечана незалежнасць судовай улады, а затрыманыя па палітычных матывах — вызваленыя.

Ці будуць прынятыя ўсе палажэнні прапанаванага праекта рэзалюцыі, пакуль сказаць цяжка. Камісія ААН па правах чалавека чымсьці нагадвае АБСЕ — больш за паўсотні краін з рознымі ўзроўнямі дэмакратыі і павагі да правоў чалавека. Тым не менш, само абмеркаванне дадзенага пытання ўказвае на зацікаўленне станам з правамі чалавека ў беларускай краіне. Гэта цешыць, бо намаганні беларускіх праваабаронцаў не прайшлі бясследна і парушэнні міжнародных пагадненняў у рэшце рэшт мусяць спыніцца. А другім бокам медалю — умацаванне аўтарытэту ААН, арганізацыі, якая нарэшце пачала спрыяць выкананню сваіх задакументаваных патрабаванняў і рэзалюцый.

Дарэчы, па вышэйзгаданым праекце рэзалюцыі прапаноўваецца прызначыць у Беларусь асабістага прадстаўніка Вярхоўнага Камісара ААН па правах чалавека, які б дэталёва вывучаў парушэнні гэтых правоў, здзейсненых урадам Беларусі.

Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь адгукнулася на праект як на „палітычна матываваны", які „ўтрымлівае сцвярджэнні, не пацверджаныя фактамі з верагодных крыніц". Амаль па прымаўцы „я — не я, і хата не мая".

Уладзімір Лапцэвіч

Лічу сябе беларускай

[1 ☞ працяг]

— За выключэннем конкурсу па гісторыі, ва ўсіх іншых я перайшла да раённых элімінацый.

— Ці хопіць часу, каб падрыхтавацца да ўсіх конкурсаў?

— Калі я прыступала да іх то думала, што перамагу толькі ў некаторых і тады буду лепш да іх рыхтавацца. Атрымалася інакш і трэба будзе вучыцца да ўсіх. Думаю, што неяк спраўлюся.

— Два гады ты была старшынёю Школьнага самаўрада, а зараз з'яўляешся яго сакратаром. Чым вы займаецеся?

— Некаторыя школьныя мерапрыемствы арганізуем самі, а ў іншых памагаем. Арганізавалі мы конкурс на найлепшага настаўніка, у якім перамаглі Анна Ляўчук, Галіна Скепка і Ян Навіцкі. Ладзілі конкурс на самы цікавы прадмет, якім вучні назвалі заняткі па інфарматыцы. У час школьных мерапрыемстваў вучні выступаюць з артыстычнай часткай на беларускай мове. Мы разам з сяброўкамі выступаем у школьным калектыве „Гама".

— У гэтым годзе трэба будзе табе вырашаць, у якую сярэднюю школу падацца.

— Хачу паступаць у Гайнаўскі беларускі ліцэй, бо мне здаецца, што гэта будзе самая лепшая для мяне школа.

— Можа ёсць ужо планы на далейшую будучыню?

— Я хацела б стаць журналістам або суддзёй і рабіць тое, што мяне цікавіць. Здаецца мне, што гэтыя прафесіі зацікавілі б мяне.

— Дзякую за размову.

Гутарыў Аляксей Мароз

Рэканструкцыя „Гарадніцы"

Падобна на тое, што гродзенскія ўлады хутка возьмуцца за рэканструкцыю гістарычнай Швайцарскай даліны — так званай „Гарадніцы", якая знаходзіцца ў цэнтры Гродна ў раёне вуліцы Элізы Ажэшкі. „Рэканструкцыя" якраз упісваецца ў ініцыяванае прэзідэнтам Аляксандрам Лукашэнкам сёлетняе „добраўпарадкаванне Беларусі". Але ці атрымаецца добраўпарадкаваць Швайцарскую даліну належным чынам — пакуль невядома.

Планы і задумы па рэканструкцыі „Гарадніцы" існуюць ужо не адзін год. Розняцца адно канцэпцыі і падыходы спецыялістаў да праблемы аднаўлення гістарычнага аблічча маляўнічай мясціны. Бо, на першы погляд, адносна невялікая ў памерах горада прастора з'яўляецца адначасова вельмі складаным паводле геадэзічных параметраў „участкам" і патрабуе шмат падрыхтоўчай працы, не кажучы пра значныя фінансавыя ўкладанні. Найбольш цікавы праект рэканструкцыі „Гарадніцы" прапанаваў старшыня абласнога аддзялення Саюза беларускіх архітэктараў Аляксандр Штэн.

— Над гэтым праектам я працаваў дзевяць месяцаў, — прызнаецца аўтар. — І цяпер ён павінен быць зацверджаны Дэпартаментам па захаванні нацыянальнай спадчыны ў Мінску. Тады працы на вызначанай тэрыторыі пачнуцца ўжо ўлетку, з надыходам сапраўднай цеплыні. Нешта можна было зрабіць ужо ў мінулым годзе, бо ў мясцовым бюджэце тады меліся немалыя сродкі на экалогію і добраўпарадкаванне, але іх своечасова не „асвоілі" па прызначэнні...

Аляксандр Штэн лічыцца ў Гродне адным з самых таленавітых і знаных спецыялістаў. Ягоны праект рэканструкцыі Швайцарскай даліны сапраўды ўражвае. Аўтар улічыў, змераў і перапісаў кожнае дрэва, кожны кусцік, каб ні ў якім выпадку не парушаць натуральнасць прыроднага ландшафту. За базавы матэрыял ён узяў план рэканструкцыі „Гарадніцы", створаны яшчэ „за польскім часам" у 1931-1933 гг. Гэты ж план бралі за ўзор і немцы падчас акупацыі ў 1941-1944 гг. Аднак „пры саветах" паважнымі распрацоўкамі „Гарадніцы" ніхто не займаўся. Трэба было змагацца „на ідэалагічным фронце"...

Цяперашнія кіраўнікі Гродзеншчыны ўсур'ёз заняліся добраўпарадкаваннем горада. З гэтай нагоды напрыканцы сакавіка старшыня гродзенскага гарвыканкама Аляксандр Антоненка правёў адмысловую прэс-канферэнцыю. Высветлілася, што 25% мясцовай каналізацыі патрабуе капітальнага рамонту. Чакае тэрміновага вырашэння набалелая праблема „аварыйнасці Каложскай царквы". Ужо шмат гадоў ідзе гаворка пра ўмацаванне крутога берага Нёмана, каб уратаваць пэрлу беларускага дойлідства — Барыса-Глебскую царкву XII стагоддзя ад магчымай катастрофы — падмыву ракой і абсоўвання грунту.

Гродзенскія ўлады вядуць зараз перамовы і з польскімі фірмамі ў справе утылізацыі побытавых адкідаў. Эксперымент з новымі скрынямі для смецця спярша правядуць у мястэчку вілаў і катэджаў — прадмесці Гродна „Паўднёвы". Курыруе „добраўпарадкаванне горада" намеснік старшыні гарвыканкама Анатоль Кунаш.

Не менш набалелай у Гродне з'яўляецца праблема пабудовы новых грамадскіх прыбіральняў, якіх катастрафічна не хапае ў горадзе. Знакамітая грамадская прыбіральня, што на Савецкай плошчы насупраць Фарнага касцёла, ужо перададзена ў прыватныя рукі. А тая, што ў Парку імя Жылібера, — больш за год зачыненая на рамонт. Не цяжка ўявіць сітуацыю, калі з надыходам сапраўднай цеплыні распачнецца паўсюдны вулічны гандаль півам...

— У сваім праекце рэканструкцыі „Гарадніцы" я прадугледзеў пабудову новага туалета, — працягвае свой аповед архітэктар Аляксандр Штэн. — Гэта вельмі важны элемент захавання чысціні на гэтай тэрыторыі. Акрамя запланаваных сцяжынак, лавак, ліхтароў, альтанак, мосцікаў праз рэчку Гараднічанку і дэкаратыўных водных каскадаў, трэба будзе абавязкова збудаваць ліўневую каналізацыю і лакальныя фільтры для ачысткі вады...

Усё гэта файна. Але пакуль невядома: ці ўдасца гродзенскім уладам у абвешчаны прэзідэнтам „год добраўпарадкавання Беларусі" рэалізаваць на практыцы свае задумкі і ўлічыць рэкамендацыі спецыялістаў. Бясспрэчна адно: метадычнае захаванне чысціні толькі падкрэсліць прыгажосць горада над Нёманам.

Юры Гумянюк

У 17 гадавіну аварыі на Чарнобыльскай АЭС

Чарнобыльскі шлях

Зорка ў палыне, легенда ці быль?
Сёння ўвесь свет пракляў Чарнабыль.
Полымя, выбух і страшная хмара...
Проста здарэнне? Ці Божая кара?!
Фон радыяцыі, вецер і пыл.
Чорнаю памяццю стаў Чарнабыль.
Жудаснай смерцю ад выбуху дуе,
Малых і старых — ніяк не шкадуе.
Украіна, Польшча, Расія, Літва —
Усіх дакранула агульна бяда.
Толькі пракляцце, чаму павялося,
Зноў Беларусі за ўсіх дасталося!
Як ў той вайне, „матаем на вус",
Кожны чацвёрты ў зямлі беларус?
Жах над краінай, слёзы ў вачах.
Д'ябал на „троне", на людскіх касцях.
Што нам хлусня „канстытуцый гарантаў",
Палкамі б'ючых народ міліцыянтаў.
Яднаны бядою, усім гадам назло,
Каб людскіх ахвяраў ужо больш не было...
З крыжам і сцягам, грамадскім размахам
Крочым усе разам Чарнобыльскім шляхам!

Міхась Каралёў

Вялікае дзякуй

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Люба Гаўрылюк з новавышытай навалачкай

У канцы 2001 года Ада Чачуга на гэтых старонках усхвалявана напісала пра трагедыю выдатна вядомай любіцелям беларускай песні Любы Гаўрылюк, пра пажар яе хаты. Падаўся я ў Козлікі пабачыць, як яна жыве сёння.

Разбудзілася я на досвітку, — расказвае Люба Гаўрылюк, — і якоесь прадчуванне авалодала мною. Думала на гару лезці, бо нейкі трэск было чуваць, святло запаліла. Забрахаў сабака. Прыбег сусед і сказаў, што наша хата гарыць. Вока на гару ён адкрыў, злапала паветра і давай агонь клубаваць. Ветру не было і хата гарэла як свечка.

Ад чаго загарэлася — мы і сёння не ведаем. Комін на двух дылях стаяў, пацукі, якіх поўна было, бо да хаты быў прыбудаваны хлеў, гняздо там мелі, у якое мо іскра дасталася...

Найхутчэй прыехалі заблудаўскія пажарнікі, хаця яны і далёка ад сябе жывуць; не мінула паўгадзіны, як прыехалі. А ў Беласток не маглі дазваніцца...

І невядома, што забіраць. Скрынкі вынесла пад плот на снег. Суседзі прыбеглі і маразілку вырвалі. І газавы балон з пліткай вынеслі. Свінню з парасятамі людзі з хлява ў гараж выкінулі. Мужчыны мэблю павыносілі, а бабы шматы. І торбу з дакументамі вынеслі.

Шыфер на нашай хаце стаў страляць, аж кускі ад яго да трэцяга суседа несла. І бляху над акном стала круціць. І ў суседа шыфер стаў паднімацца. Гара наша згарэла і першая столь, і вугал у хаце выгарэў. І хлеў да хаты прыстаўлены... У хляве цюкі ляжалі, збожжа намокла. Спярша збожжа замерзла, а як адлігла — паплеснела і давялося выкінуць.

Спачатку, у той самы дзень, як пажар быў, хату фольгай прыкрылі і накрылі трыма фурамі саломы. І грэлі цэнтральнае ацяпленне, каб не даць вадзе замерзнуць. А мы сталі жыць у летняй кухні. Найважнейшае, што самі жывымі асталіся. А калі б пажар уначы ўспыхнуў...

Згарэла ўсё, што на гарэ было. Сем штук вышываных кажухоў бацькоў і Алі, і душагрэйкі. Гвязда саракагадовая згарэла, якую мой тата быў зрабіў, а мы яе аднавілі. Аліна батлейка, і баян стобасавы, і даўнейшыя навалачкі на падушкі, і новыя вышыванкі, і многа строяў беластоцкага калектыву, што на гарэ былі.

Бачыць пажар і чуць пра яго гэта ніколі не пажадаеш. Але перажыць!.. Мне халестэрын падскочыў на трыста, а раней не было.

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Адбудаваная хата Гаўрылюкоў у Козліках

Людзі многа памаглі. Суседзі з Козлікаў і суседніх вёсак. І калектыў з Козлікаў, і беластоцкі калектыў, і беларускае таварыства, і „Ніва". І беларускі ліцэй у Бельску, і бацюшка Сасна. Адзін сусед з вёскі дзвесце злотаў даў, і нават з Сідры адзін пан сто злотаў прыслаў. Пры такой бядзе то кожная залатоўка дарагая. А мы акурат хаты не застрахавалі, бо на лячэнне трэба было збіраць.

Піваварня „Дайліды" многа дала — на латы хапіла. І людзі матэрыял далі. Тартак у Козліках парэзаў драўніну на кроквы і латы і ні граша не ўзяў. Цэлы год адбудоўвалі хату, па 6-8 мужчын у дзень працавала. Мае браты Мікалай і Ян сталярскія і будаўнічыя работы зрабілі, а мужавай сястры зяці выканалі электраабсталяванне. Бо калі б прыйшлося плаціць, то не ведаю...

Сцены мылі, замалёўвалі. Казалі, што чуць будзе гарам, але не — удалося. Летам вокны адчынялі — каб ветрала.

Усіх, што дапамагалі, падала ў царкву, каб бацюшка маліўся за іх.

* * *

Спадарства Гаўрылюкоў наведаў я больш за год ад трагедыі. Сёння няма ўжо вонкавай пазнакі ад пажару. Але боль астаўся, бо страчана шмат каштоўнасцей, якія вырабілі працавітыя рукі Любы Гаўрылюк. Шырокай грамадскасці яна галоўным чынам вядомая са сцэнаў, на якіх адбываліся беларускія фальклорныя мерапрыемствы; яе рукадзелле вядомае крыху менш. І сёння спадарыня Люба Гаўрылюк намагаецца аднавіць тыя каштоўнасці, якія каварна забраў агонь. Упрыгожаныя ажурам ручнікі, напісаныя каляровымі ніткамі карціны на навалачках — усё гэта патрабуе аграмаднай карпатлівай працы: абдумаць узор: а пасля тысячамі дакладна разлічаных штрыхоў іголкай ці кручком выявіць яго. Колькі часу спатрэбіцца на ўсё гэта! А яшчэ ж і рэпетыцыі, і хатняе гаспадыняванне... І калі хто якую справу ў Козліках мае, дык кіруецца першачаргова да Любы Гаўрылюк. А яна ўсё маладая духам, дзелавая.

Незвычайная жанчына! Яна нястомна, быццам тая працавітая пчолка, спадчынныя каштоўнасці палівае мёдам на нашы душы. Вялікае ёй дзякуй! І ўсім тым, хто спагадлівым сэрцам адгукнуўся на яе бяду, таксама — ВЯЛІКАЕ ДЗЯКУЙ!

Аляксандр Вярбіцкі

Акадэмічныя дні працы

Ужо трэці раз у Беластоку адбыліся адрасаваныя вучням і студэнтам III Акадэмічныя дні працы. Мерапрыемства, патранат над якім трымае „Кур'ер паранны", мае дапамагчы моладзі знайсці працу.

Арганізатары запрасілі да ўдзелу 15 фірм з Падляшскага ваяводства, якія прыцягнулі ўвагу каля васьмісот зацікаўленых працай асоб. Перад імі запрэзентаваліся такія фірмы, як ITC, Compensa, CC Au Pair, JDJ Bachalski, Auchan, Royal PBK, BGŻ, Philips. Вялікім зацікаўленнем карысталіся працоўныя стажы і праца ў ЗША і Вялікабрытаніі, якія ствараюць шанс папраўіць моўныя здольнасці.

Ад 2 да 4 красавіка ва універсітэце і політэхніцы ў дваццаці групах вяліся заняткі па падрыхтоўцы да размовы з работадаўцам і прэзентацыі сваіх магчымасцей.

На маё пытанне, на што можна разлічваць пасля такіх заняткаў, студэнтка чацвёртага курса маркетынгу Беластоцкай політэхнікі Альжбета Кананюк сказала: „Нават студэнты такіх папулярных спецыяльнасцей, як маркетынг, архітэктура, эканомія, не маюць вялікіх шанцаў на працу ў нашым ваяводстве. Дні працы гэта, па-мойму, толькі паказуха, каб чыноўнікі маглі сказаць, што ўлады памагаюць студэнтам, што яны робяць усё, каб паменшыць беспрацоўе. Праўда зусім іншая. Найлепшым прыкладам гэтаму прапановы Ашона, якімі ў мінулым годзе пакарысталіся мае сябры. Праца, якую прыйшлося ім выконваць, аказалася зусім іншай, а грошы... лепш не гаварыць".

У падобным тоне адказаў мне Пётр Ахрыцюк, студэнт турыстычнага аддзялення: „Разам з сябрамі аглядалі мы прапановы фірмаў і, папраўдзе, няма з чаго выбіраць. Лепш купіць газету з аб'явамі, бо там можна цікавейшыя прапановы знайсці. Мы, студэнты, не ведаем, ці пасля заканчэння вучобы знойдзем працу. Праўда такая, што калі маеш знаёмых, або як гаворыць — добрыя плечы, то будзе праца, а як не, то вернешся на гаршчок бацькоў".

Так песімістычна настаўленых студэнтаў было намнога больш.

Вялікую зацікаўленасць моладзі выклікаюць прапановы працы ў ЗША. Візу можна атрымаць без праблемаў, на месцы будзе кватэра, добра платная работа. Так, але не дарма. Каб выехаць, патрэбны грошы на білет. І бацькі пазычаюць ад знаёмых, бяруць крэдыты і сынок ці дачушка едуць у Амерыку! Фактычна, для большасці з іх, для гэтых разумнейшых, якія адразу шукаюць другую дадатковую працу, такая паездка аплачваецца.

Каб атрымаць добрую працу на Падляшшы, трэба мець прынамсі 2-3-гадовы вопыт, ведаць сама меней дзве мовы (найлепш англійскую або нямецкую і рускую), мець аўтамашыну і быць гатоўным на заказы 24 гадзіны ў суткі. А такія патрабаванні выканаць няпроста.

Паўліна Шафран

Супярэчлівая гімназія

У час сесіі Рады горада Гайнаўкі, якая адбылася 31 сакавіка, бурную дыскусію выклікала прапанова бурмістра Анатоля Ахрыцюка стварыць у Гайнаўцы Гімназію н-р 3 з інтэгравамі аддзяленнямі. Супраць гэтай прапановы выступілі радныя Беларуска-народнага выбарчага камітэта. Звярнулі яны ўвагу, што стварэнне чарговай гімназіі ў горадзе, у якім пастаянна скарачаецца колькасць дзяцей, спрычыніцца абмежаванню колькасці кандыдатаў у Гімназію з дадатковым навучаннем беларускай мовы. Гэта магло б давесці да ліквідацыі беларускай гімназіі.

— Большасць з нас памятае, як цяжка было арганізаваць беларускую гімназію. Аднак на працягу чатырох гадоў дзейнасці яна добра ўпісалася ў асветную карту Гайнаўкі. Гэта дзякуючы ўзнікненню беларускай гімназіі выдатна павялічылася колькасць дзяцей, якія вывучаюць беларускую мову. Адной з задач Беларуска-народнага выбарчага камітэта з'яўляецца дбайнасць, каб навучанне беларускай мовы стала ўсеагульным, а сённяшняя пастанова напэўна гэтаму не спрыяе, — зачытаў заяву БНВК дырэктар Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы Яўген Сачко.

Ад імя грамадскасці сваёй школы Яўген Сачко прасіў стварыць лепшыя ўмовы для белгімназіі і пакрытыкаваў асветную дзейнасць улад Гайнаўкі на працягу апошніх чатырох гадоў. Паводле яго, непатрэбна абмяжоўвалася колькасць аддзяленняў Падставовай школы н-р 2, у якой былі добрыя ўмовы навучання. За апошнія гады разбудавана была Падставовая школа н-р 5, а рамонт яе старых будынкаў патрабаваў вялікіх фінансавых сродкаў. Для патрэб гэтай школы рамантаваны быў будынак Польскай аб'яднанай рабочай партыі. Калі перадавалі яго ў карыстанне Політэхнічнаму інстытуту, трэба было нанава перарабляць некаторыя змяненні. Напрыклад, гімнастычная зала назад стала канферэнц-залай. Зараз прапануецца перасяліць школу н-р 5 у будынкі ПШ н-р 1. Дырэктар Яўген Сачко крытычна ацаніў прапанову ліквідацыі Падставовай школы н-р 3, у якой спрыяльная атмасфера і добрыя ўмовы навучання.

Бурмістр Анатоль Ахрыцюк і радныя ад СЛД і правых груповак пераканалі за стварэнне новай гімназіі з інтэграцыйнымі аддзяленнямі. У галасаванні „за" выказаліся 13 радных (супраць прагаласавала 6 радных, у тым ліку ўсе 5 радных БНВК і 1 устрымаўся). На базе Гімназіі н-р 3 і Падставовай школы н-р 2 быў створаны Комплекс школ з інтэграцыйнымі аддзяленнямі.

Многа дыскусіі выклікаў праект павышэння цэн на ваду, транспарт і ачышчанне сцёкаў. Большасць радных (12 асоб) прагаласавалі за новымі цэнамі (вада падражэла з 1,25 на 1,36 зл., а сцёкі — з 1,85 на 2,15 зл.).

Аляксей Мароз

У Іраку будуюць дарогі

Пасля трох тыдняў вайны амерыканскіх, англійскіх, польскіх і аўстралійскіх войск супраць Ірака „вызваліцелі" захапілі Багдад і аб'явілі перамогу. У варшаўскім тэлебачанні паказалі каля сотні калабарантаў, якія здзекаваліся над разбураным амерыканцамі помнікам Садаму Гусейну. У той жа дзень польскія журналісты і публіцысты паўтаралі, што іракскі народ вельмі ўдзячны амерыканцам за вызваленне і самастойна рушыў знішчаць сімвалы свае няволі. Народам назвалі сотню людзей з ліку пяцімільённага насельніцтва сталіцы Ірака. У „вызваленых" гарадах, у якіх спыніла працу іракская ўлада, пераможцы стварылі люду ўмовы для выяўлення поўнай свабоды. Натоўп кінуўся рабаваць усё, што ўяўляла якую-небудзь каштоўнасць. Дзень „вызвалення" абярнуўся ў горшы кашмар за дні і ночы пад амерыканскімі бомбамі, — гаварылі пазбаўленыя маёмасці іракцы. Помнікі старажытнай культуры, якія прастаялі тысячагоддзі — былі разбіты або расцягнуты мясцовымі бамжамі.

Яшчэ падалі бомбы, гучалі выстралы, а „дэмакратычны і прагрэсіўны" свет пачаў разважаць пра адбудову Ірака. Вялікі брат з-за акіяна вызначыў на дапаможнікаў у „адбудове" толькі найбольш адданых яму саюзнікаў. Палічылі нават, што кошт вайны абышоўся сумай каля 40 мільярдаў долараў, але ў распараджэнні „вызваліцеляў" апынуліся залежы нафты вартыя 8,5 більёна долараў. Такога багацця не захапіў нават Юлій Цэзар у старажытным Егіпце.

Несумненна, у Іраку будуць будаваць дарогі і нафтаправоды. Сыравіну трэба неяк давезці ў парты. Іракцам таксама будзе зручней атрымліваць свежыя бананы, чыпсы, гамбургеры і кока-колу. Можа некаторыя будуць яшчэ страляць да свабодалюбівых амерыканскіх салдатаў, але „свабодныя і незалежныя сродкі масавай інфармацыі" напэўна высветляць сусветнаму грамадству, што гэта шалёныя злачынцы ад Садама або нават і сам Бен Ладэн.

Едучы самаходам па беластоцкіх дарогах чалавек задумоўваецца як выглядаюць вуліцы Багдада пасля „вызвалення". У нас немагчыма праехаць і сотні метраў, каб не ўваліцца ў яму. Пра меншыя дзіркі не варта нават успамінаць. Хаця наша краіна знаходзіцца ў стане вайны з Іракам, але, здаецца, гэта не іракская авіяцыя ўчыніла тут такое спусташэнне.

Кожнага дня ў тэлебачанні можна пачуць як салідарнасць з іракскім народам прымушае нашых дзяржаўных дзеячаў пасылаць будаўнічых у Ірак дапамагаць жыхарам гэтай краіны прыйсці да дабрабыту і дэмакратыі. Дзеля гэтага будуць арабам пракладаць дарогі, узводзіць палацы і фабрыкі. Але з другога боку, калі глыбей над гэтым задумацца, можна засумнявацца, ці іракцам нехта дазволіць ездзіць па гэтых аўтастрадах. У тэлебачанні паказалі таксама, што ўсе дарогі хуткага руху знаходзяцца цяпер выключна ў распараджэнні амерыканскіх генералаў. Энтузіязм будаўніцтва на арабскай зямлі проста прымушае схіліць галаву перад дабрачыннасцю Буша, Блера ці Кваснеўскага, а таксама ўласнікаў шматлікіх фірмаў, якія проста жывуць ідэяй будавання і толькі мараць, каб служыць няшчасным арабам, якія так доўга цярпелі пад панаваннем тырана. Можна спадзявацца, што багацце іракскай зямлі будзе добра выкарыстана. Да гэтай пары яно проста нішчэла, а садамаўскія салдаты нават час ад часу наўмысна падпальвалі нафтавыя вышкі.

Цывілізацыя ў Ірак прыляцела на амерыканскіх самалётах Б-52 ды прыехала на насычаных электронікай танках. Працягваецца паляванне на кіраўніцтва краіны. Можна, напрыклад, падумаць, што было б у снежні 1981 года, калі б не было Савецкага Саюза і амерыканцы з іншымі краінамі „свабоднага свету" рушылі б вызваляць палякаў ад рэжыму Войцеха Ярузельскага. Калі б сучасныя кіраўнікі краіны, якія тады былі членамі цэнтральных улад камуністычнай партыі, не загінулі ад інтэлігентных бомбаў, „вызваліцелі" несумненна паставілі б іх перад судом, абвінаваціўшы ў праследаванні дэмакратычнай апазіцыі. Мала аднак праўдападобна, што вызваліцелі пабудавалі б палякам такія ж камфартабельныя дарогі як цяпер іракцам. У Польшчы ёсць толькі вугаль, а гэта надта танная сыравіна. Саюзнікам вялікі брат з-за акіяна дарог наогул не будуе, а толькі прадае самалёты, якія павінны выкарыстоўвацца ў чарговых мірных місіях, як у Іраку, а раней — у Сербіі. Амерыканскія палітыкі ўжо загаварылі пра небяспечныя „для свабоднага свету" рэжымы ў Сірыі і Іране...

Яўген Міранові́ч

Вачыма паляка

Пра тое ды сёе

Святочная лянота паўплывала на тое, што не магу лагічна ахапіць у думках таго ўсяго, што ў апошні час да мяне даходзіць. Дазвольце тады, што падзялюся з вамі назіраннямі, як кадрамі ў фільме, якога не адладзілі мантажысты. Вось, так.

Талерантнасць

Пачуў я, што ў беластоцкім VII Агульнаадукацыйным ліцэі педагогі вялі заняткі прысвечаныя нацыянальным меншасцям у Польшчы, перш за ўсё ў рэгіёне. Хвала, хвала! Старанні звянчала выстава і паказ м.інш. адзення розных нацый. Аднак, перад гэтым у школе правялі апытанне. Вынікала з яго, што моладзь гэтай школы — за талерантнасць, сама яна талерантная, але толькі дзесяцёра з некалькіх соцень вучняў села б за адну парту з яўрэем ці арабам. Думаю, што гэта параза педагогаў „сямёркі". І куды іх старанні! А, можа, справа была толькі ў тым, каб „урокі талерантнасці" медыяльна раздзьмухаць (я чуў аб іх у тэлебачанні), настаўніцкае кола і дырэкцыя школы маглі паказацца перад кураторыяй асветы? Цікава, ці тыя настаўнікі, пасланыя на нейкае там абучэнне-камандзіроўку, не мелі б нічога супраць, каб закватаравалі іх у гасцінічным пакоі з „чужым" — жыдом, арабам?

Еўрасаюз

Калі чытаеце гэты тэкст, у Афінах (у Грэцыі, а не на Сувальшчыне) падпісалі ўжо Уваходны трактат, адпаведна з якім ад будучага года будзем ужо ў Еўрасаюзе. Тым часам сродкі масавай інфармацыі ідуць упераганкі ў заваёўванні сваіх атрымальнікаў і прапануюць удзел у апытанні, якое гэта пытанне павінна прагучаць у чэрвеньскім еўрасаюзным рэферэндуме. Да выбару ёсць чатыры адказы. Кожны дурань, такі, як і для прыкладу я, ведае, што чым прасцей, тым лепш. Так, вось, найлепш было б, калі б мяне пыталі, ці Польшча хоча быць у ЕС, ці не. Не ведаю, для чаго тыя чатырохкратныя камбінацыі. Можа, каб зацікавіць такім чынам гэтым рэферэндумам? Можа? Толькі што тэлестанцыі, якія прапануюць мне выслаць адказ па мабільным тэлефоне хочуць за гэта 1 злот 11 грошаў плюс ПДВ. Я ўпэўнены, што такім чынам на Еўрасаюзе скарыстаюць аператары мабільных тэлефонаў. Ды дзе тут карысць мая?

Шанц поспеху

Падмацаваўся я, гледзячы тэлевізійную праграму *Szansa na sukces*. Вось сярод маладых (і не толькі) выканаўцаў, якія выконвалі песні гурту „Vox" паявіўся беларус, Генадзь Лоска. Як тлумачыўся, эміграваў ён са свае краіны, дзесьці з-пад Бярозы, найперш у Аўгустаў, пасля трапіў у Беласток, каб канчаткова пасяліцца ў Кракаве. Генадзь паразіў голасам — ахрыплым, як у рокмена. Мне прыемна, калі пра гэта пішу ў „Ніву". У Кракаве, апроч Алёшы Аўдзеева, будзе другая зорка з-за ўсходняй польскай мяжы — якраз гэты Генадзь Лоска. У заходняй Польшчы, калі глядзець з перспектывы Беластока на Віслу, можа, будуць беларусы асацыявацца не толькі з сіплым голасам Аляксандра Лукашэнкі.

Фестывальны палац

Неяк так усё збеглася, што паглядзеў я першы конкурс „Eurobest", які перадавалі некаторыя няпольскія тэлестанцыі з Палаца фестываляў у французскіх Канах. Быў гэта такі паказ лаўрэатаў тэлешоу, якія ў некаторых еўрапейскіх краінах робяць пад шыльдай „Start Academy" ці, як у Расіі, „Фабрика звёзд". Не было сярод дзевяткі выканаўцаў ні прадстаўніка Польшчы, ні Беларусі. Перамагла галасамі журы (прадстаўнікі кожнай краіны-ўдзельніцы) маладая, прыгожая і таленавітая іспанка. Мае фаварыты — расійскі бойз-бэнд „Корні" апынуўся недзе пасярэдзіне. Так я сабе глядзеў гэты конкурс і думаў: што з таго, што еўрапейскія ці сусветныя ўрады намячаюць сабе межы, калі людзі, іх таленты і думкі, значыць, тое, што ёсць існасцю народаў і грамадстваў, ходзяць сваімі дарогамі. Як не праз такія конкурсы, як у Канах, то праз Інтэрнэт ці спадарожнікавае тэлебачанне. Дарэчы, дзякуючы гэтаму апошняму мог я аб гэтым паразважаць, аглядаючы „Eurobest".

Святочная чародка

Дабрадзейнае ў сваіх пачынах беластоцкае Згуртаванне „Дарога", якое вядзе каталіцкі святар Эдвард Конкаль, наладзіла ў чарговы раз перад заходнехрысціянскім Вялікаднем яслі пад помнікам Ю. Пілсудскаму. Усё было б cool, каб не запратэставалі г.зв. патрыёты. Вось, апрача ўласнаручна падрыхтаваных святочных цацак, у клетцы гагаталі ўкормленыя гусі, квакалі каляровыя качкі і свіргатала іншае птаства. І так тое птаства папахвала пад Пілсудскім па-свойму, бо ж там жа і какала, значыць, ля маршалкавага падножжа, і гэтым самым выклікала абурэнне патрыятычна настроеных прахожых. Мяне той птушыны паказ пацешыў, дзякуючы бабульцы ў хусціне, якая, здаецца, прыехала ў ваяводскую метраполію за святочнымі пакупкамі. Па дарозе з крамы „Дэлікатэсы" спынілася яна ля клеткі пад Пілсудскім і запытала ў маладога чалавека, які апекаваўся птахамі: „А па чэму та гонска?" Вядома, пачула, што яна не на продаж. Прызнаюся, што сам прыняў бы я такую на велікодны стол, з печаным яблычкам.

Бегемоты з дэльфінамі

У тэлебачанні паказалі цікавы фільм пра бегемотаў. І, чуеце, у гэтых прыгожых жывёл былі супольныя продкі з дэльфінамі. Так, так! Калі так, то ёсць у мяне аргумент для тых, якія здзіўляюцца, што я — паляк — пішу ў беларускую „Ніву". Адказваю цяпер і назаўжды, вершам: *Mają hipopotamy wspólnych przodków z delfinami, ma i Chołodowski z Białorusinami*.

Мацей Халадоўскі

Юбілейная сустрэча

На юбілейнае спатканне, якое адбылося 21 сакавіка ў Гарадской публічнай бібліятэцы ў Гайнаўцы з нагоды святкавання пяцігоддзя дзейнасці Літаратурнага клуба, прыйшлі яго члены, запрошаныя госці і моладзь. Сустрэча арганізавалася ў бібліятэцы, пры якой клуб узнік і існуе. Старшыня Эдвард Ліпінскі расказаў пра дзейнасць клуба і выдавецкія поспехі. Успомніў заснавальнікаў, сярод якіх былі нашы карэспандэнты Ян Целушэцкі, Славамір Кулік і настаўнік белліцэя Міхал Юшчук.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Пра дзейнасць клуба расказаў Эдвард Ліпінскі

— Стараймася пакінуць па сабе нешта трывалае, паказаць, што мы тут былі. Важна, каб напісанае намі было перадуманым, — заявіў Эдвард Ліпінскі. Гаварыў ён пра сваю творчасць і нядаўна выдадзены зборнік вершаў пастаянных членаў клуба. Старшыня Настаўніцкага літаратурнага клуба ў Беластоку Ірэна Грабавецкая пахваліла гайнаўскіх творцаў і адначасна звярнула ўвагу на няспеласць часткі паэзіі.

— Калі будзеце працаваць са словам, бачу паспяховую будучыню для клуба, — заявіла Ірэна Грабавецкая.

Членаў Літаратурнага клуба павіншавалі працаўнікі бібліятэкі і госці. Спатканне закончылася чытаннем вершаў гайнаўскіх творцаў.

(ам-з)

Датчане ў Шлезвіг-Гольштэйне

Датчане ў Нямеччыне займаюць паўночую частку краіны-ланда Шлезвіг-Гольштэйна. Іх колькасць мяркуецца на 50-60 тысяч. Меншасць актыўна ўдзельнічае ў палітычным і гаспадарчым ды культурным жыцці рэгіёна і краіны.

Як адзіныя ў свеце нацмены выдаюць газету-штодзёнку: *Flensborg Avis*. Выходзіць яна з 1869 года і з'яўляецца найстарэйшай газетай нацыянальных меншасцей у Нямеччыне.

F. A. Lohmüller

Шлезвіг-Гольштэйн займае першае месца ў Нямеччыне ў галіне выкарыстання энергіі ветру

Адкуль датчане ў Нямеччыне?

Датчане пражываюць на сваіх этнічных землях, якія раней належалі Даніі, а з 1864 г. — Прусіі. Тэрытарыяльны абсяг вызначаюць лініі: на поўначы — мяжа з Даніяй, на поўдні — рака Айдэр. Ніжэй ракі Айдэр не выступаюць большыя населеныя датчанамі пункты.

У межах Нямеччыны датчане апынуліся пасля мірнага Версальскага дагавору з 28 чэрвеня 1919 года. Тэрыторыя Шлезвіга была раздзелена на дзве акругі, і іх прыналежнасць мелі вызначыць самі жыхары. Плебісцыт праходзіў 10 лютага і 14 сакавіка 1920 года. У паўночнай акрузе большасць прагаласавала за прыналежнасць да Даніі, у паўднёвай — да Нямеччыны. Пад уплывам вынікаў плебісцыту была праведзена новая мяжа, аднак па абодвух яе баках надалей заставалася пэўная колькасць немцаў і датчан. Таму рашэнні ў адносінах да адной меншасці мелі ўплыў на сітуацыю другой.

Выпрацавалі еўрапейскія ўзоры

Сёння сітуацыя датчан у Шлезвігу-Гольштэйне лічыцца еўрапейскім узорам у галіне аховы правоў нацыянальных меншасцей. Спецыялісты жартуюць, што тут паспрыяў прускі дух пашаны для закону. Свой юрыдычны статус дацкая меншасць вызначыла ўжо ў 1947 годзе, дарэчы, пры дапамозе брытанцаў, якія акупіравалі іх тэрыторыю. У першую чаргу была афармлена справа школьніцтва. У дацкія школы маглі запісацца адно дзеці, якіх прынамсі адзін з бацькоў прыналежаў да Аб'яднання Паўднёвага Шлезвіга (SSF — Sydslesvigsk Forening), або тыя, што ўжо вучыліся ў дацкіх школах. Такая сітуацыя ўзнікла ад „маланкавага" росту прадстаўнікоў дацкай меншасці. Пасля вайны аселі тут тысячы перасяленцаў з Усходняй Прусіі і Польшчы, для якіх нацыянальную прыналежнасць часта вызначала кан'юнктура. Спачатку дзеячы згаданага Аб'яднання дамагаліся перасялення ўцекачоў, якіх тут было найбольш у параўнанні з іншымі ландамі. Узамен датчане атрымалі спецыяльны выбарчы статус, іх перастаў абавязваць пяціпрацэнтны выбарчы парог. У практыцы гэта абазначае гарантыю займець прынамсі аднаго дэпутата ў Ландтагу. Такую ж прывілею атрымалі немцы ў Даніі (у 1955 годзе). Сёння адсутнасць пяціпрацэнтнага выбарчага парога лічыцца еўрапейскім стандартам у дачыненні да меншасцей. У Польшчы ён усё не дзейнічае, што балюча адчулі беларусы ў час апошніх выбараў у самаўрады.

Паводле шлезвігска-гольштэйнскага ўзору — сучаснае разуменне справы вызначэння нацыянальнай меншасці. Мы самі можам свабодна акрэсліць сваю нацыянальную прыналежнасць, згодна з уласнымі перакананнямі. У кожным выпадку праблемы не можа вырашаць за нас чыноўнік, этнограф ці палітык. Рэальны лік меншасці вызначаюць выбарчыя вынікі.

Нацыянальнае школьніцтва і арганізацыі

У дацкай меншасці ў Нямеччыне на высокім узроўні нацыянальнае школьніцтва. Згаданыя абмежаванні былі адменены ўжо ў 1949 г. у Кільскай дэкларацыі краёвага ўрада Шлезвіг-Гольштэйна. Зараз пра навучанне дзіцяці ў дацкай школе вырашаюць бацькі. Дацкія навучальныя ўстановы дзейнічаюць на прынцыпах прыватнага школьніцтва. Іх кошт у 80% аплачвае дзяржава. Такім чынам бацькі могуць прыдбаць найлепшых настаўнікаў і наладзіць навучанне на самым высокім узроўні.

За працай школьніцтва назірае Дацкі школьны саюз у Паўднёвым Шлезвігу.

Традыцыя нацыянальных школ — з часоў плебісцыту 1920 г. Найбольшая колькасць навучэнцаў (па згаданых прычынах) была ў 1947 годзе — 14,2 тысячы. У наступных гадах назіраем значнае зніжэнне ліку вучняў. У 1963/64 было 74 школы і 3 845 навучэнцаў. Сёння ў 53 дацкія школы ходзіць 5 200 вучняў, дзейнічаюць таксама 63 дзіцячыя садкі з 1 900 дзяцьмі.

Галоўная арганізацыя меншасці — Аб'яднанне Паўднёвага Шлезвіга. Арганізацыя ўзнікла ў 1946 годзе, папярэднікам яе было Шлезвігскае згуртаванне, якое каранямі сягае 1843 года і пасля ў 1920 г. было вернута да жыцця. Сёння налічвае яно пад 5 000 членаў.

Дацкая меншасць вядзе актыўную палітычную дзейнасць, з 1947 года ўдзельнічае ў выбарах у Ландтаг, а ў 1949-61 гг. таксама ў Бундэстаг. Палітычным прадстаўніком дацкай (разам і фрызійскай) меншасці — Паўднёва-шлезвігскае аб'яднанне выбаршчыкаў. У выбарах у Ландтаг у 1992 набрала яно 28 245 галасоў.

Гаспадарка і культура

Да II сусветнай вайны Шлезвіг-Гольштэйн быў небагатай сельска-рыбалоўчай краінай. Яго развіццё наступае ў 1973 годзе пад уплывам фінансавай дапамогі з фондаў падтрымкі рэгіянальнай гаспадаркі. Мяняецца гаспадарчая структура, развіваецца прамысловасць і інфраструктура, сельская гаспадарка мадэрнізуецца. Зараз належыць да самых сучасных у Нямеччыне. У асноўным апіраецца яна на гадоўлю малочных кароў і авечак. Вядомая і на Беласточчыне карова шлезвігска-фрызійскай пароды. Шлезвіг-Гольштэйн займае першае месца ў Нямеччыне ў галіне выкарыстання энергіі ветру — працуе тут 1 500 электрастанцый-ветракоў. У Любеку і Кілі працуюць 3 універсітэты і 2 вышэйшыя прыватныя прафесійныя школы. Міжнародную вядомасць прыдбаў Інстытут сусветнай гаспадаркі, што ў Кільскім універсітэце. Тут знаходзіцца адна з самых багатых эканамічных бібліятэк свету. Кільскі універсітэт славіцца таксама даследамі ў галіне акеанаграфіі.

Зараз большасць датчан Нямеччыны пражывае ў наваколлі горада Фленсбурга, а таксама ў сталіцы ланда Кілі. Многія далей астаюцца жыць у вёсках і адначасна працуюць у гарадах. Вясковыя дамы датчан размерам у многім падобныя да нашых беларускіх. Пабудаваны яны з чырвонай цэглы, амаль усе дахі крытыя чырвонай чарапіцай. Яны невялікія і функцыянальныя, аднак, у адрозненні ад нашых, будынкі разам з падворкам вельмі дагледжаныя.

Датчане, як і беларусы, любяць коней. Трымаюць іх дзеля прыемнасці, палюбавацца красой гэтай жывёлы.

Ганна Кандрацюк

Крыніца: Grzegorz Janusz — *Mniejszości narodowe w Niemczech*; энцыклапедычны даведнік *Сучасная Нямеччына*.

6 конкурснае пытанне

Як называецца галоўная арганізацыя дацкай меншасці ў Нямеччыне?

Адказ: .....

Імя і прозвішча: .....

Адрас: .....

(Каб правільна адказаць на пытанне трэба ўважліва прачытаць надрукаваны побач артыкул. Адказы просім дасылаць на гэтым талоне на адрас рэдакцыі. Тэрмін дасылання адказаў — да 4 мая 2003 г.)

Узнагароды...

... за правільны адказ на ***3-яе конкурснае пытанне*** атрымоўваюць: **Аляксандр Дабчынскі** з Беластока, **Анжаліка Сельвясюк** і **Пётр Янкоўскі** з Бельска-Падляшскага.

У Еўропе аднолькавых шанцаў

У рамках праекта „У Еўропе аднолькавых шанцаў" друкуем чарговы тэкст з цыкла 12 артыкулаў, прысвечаных нацыянальным меншасцям у краінах Еўрапейскага Саюза і Польшчы. Да артыкула прыкладзена конкурснае пытанне. Аўтары правільных адказаў возьмуць удзел у штотыднёвай жараб'ёўцы трох кніжных узнагарод, а на канец праекта — галоўнага прызу: набору дапаможнікаў для вывучэння англійскай мовы. Спонсарам праекта з'яўляецца Управа Камітэта еўрапейскай інтэграцыі.

Projekt wydawniczy zrealizowano przy współpracy z Urzędem Komitetu Integracji Europejskiej w ramach konkursu otwartego dla mediów-2003.

Гімназія і ліцэй запрашаюць

Комплекс школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы 4 красавіка арганізаваў Адкрытыя дні школы. Наведалі яго вучні гайнаўскіх падставовых школ і гімназісты з Гайнаўшчыны.

Прыбылых сустракаюць белгімназісты, белліцэісты і настаўнікі. Госцям паказваюць школьны будынак і прадметныя кабінеты. У выдзеленых месцах на калідорах пра дзейнасць гурткоў зацікаўленняў і школьных клубаў расказваюць іх удзельнікі. Ліцэісты з Клуба беларускіх спраў „Граблі" гавораць пра летнікі, зімнікі, збіранне гістарычных, этнаграфічных і фальклорных матэрыялаў. Эльвіра Пліс прапануе размаўляць на беларускай мове, але госці просяць расказваць па-польску. Некаторыя вучні, якія паступаюць у белліцэй і белгімназію, толькі тут знаёмяцца з беларускім алфавітам і літаратурнай мовай. Каля стала з беларускімі матэрыяламі знаходзяцца вышываныя мясцовымі ўзорамі белыя ручнікі. Збоку — мастацкія працы гімназістаў. Некалькі вучняў пішуць іконы. Нядаўна настаўнік белліцэя і заадно іканапісец заснаваў у школе іканапісны гурток. Займаецца ў ім больш за дзесяць асоб.

Каля членаў калектыву „Знічка" стаіць магнітафон, ляжаць касеты і фатаграфіі. Вучаніцы расказваюць пра дзейнасць музычнага калектыву. Збоку стаяць школьныя валанцёры. Расказваюць яны пра дапамогу жыхарам Дома міласэрнасці „Самаранін" і вучням Спецыяльнай школы. Біялагічны гурток падрыхтаваў выстаўку аб Белавежскай пушчы аўтарства Малгажаты Карпюк. Побач біялагічнага кабінета прэзентуюцца дыпломы, якія атрымалі белліцэісты прымаючы ўдзел у конкурсах. У школе дзейнічае Еўрапейскі клуб. Жартаўліва пра журналісцкую работу расказваюць члены рэдакцыйнага калектыву школьнага часопіса „Слоўца".

Настаўніца беларускай мовы з Падставовай школы н-р 3 у Гайнаўцы Марыя Крук гаворыць, што з ліку 20 вучняў шостага класа ажно 12 збіраецца паступіць у белгімназію (усе яны вучацца беларускай мове). Усе 16 вучняў з шостых класаў Падставовай школы н-р 5, якія вывучаюць родную мову, таксама будуць вучыцца ў белгімназіі.

Дырэкцыя белліцэя плануе прыняць 120 вучняў у чатыры класы з пашыраным навучаннем прадметаў: I „а" (матэматыка і фізіка), I „б" (біялогія і хімія), I „ц" (польская мова, гісторыя і веды аб культуры) і I „д" (геаграфія, веды аб грамадстве і руская мова). Вучні, якія вучыліся беларускай мове ў гімназіі, атрымаюць дадатковыя балы. Заявы ў белліцэй трэба падаваць да 16 мая, а пасведчанні аб заканчэнні вучобы ў гімназіі і аб рэзультатах гімназічнага экзамена — да 23 чэрвеня.

Аляксей Мароз

Зорка
старонка для дзяцей

З беларускай мовай у Еўропу

Здымак Паўліны Савіцкай апынуўся ў інфармацыйным буклеце пра Еўрасаюз. Гарадоцкая гімназістка выступае тут як фіналістка конкурсу „Роднае слова". Паўліна ў пэўным сэнсе школьны амбасадар па беларускіх справах. Дае інфармацыю для беларускамоўных СМІ (сродкаў масавай інфармацыі), арыгінальна і цікава выказваецца на беларускія тэмы.

— Я ганаруся, калі ў нас такія вучні як Паўліна, — адзначае настаўніца беларускай мовы Тамара Бялькевіч. — Яна сама разумее патрэбу вывучэння роднай мовы.

Паўліна кожны год выступае ў беларускіх конкурсах. Сёлета яна лаўрэатка III месца цэнтральнага конкурсу „Роднае слова" ў Нараўцы. Яна дэкламавала „Блакітны ўспамін" Галіны Дубянецкай. Гарадоцкая гімназістка мае многа паклоннікаў таленту — у яе мілагучны голас і вялікая культура слова.

Даведнік пра Еўрасаюз падрыхтаваў Школьны еўрапейскі клуб. Дзейнічае ён пад кірункам настаўніка гісторыі Аляксандра Карпюка. Яго мэта — знаёмства з жыццём і праблемамі ў ЕС. 15 красавіка г.г. гімназісты падрыхтавалі „Еўрапейскі форум", на якім выказваліся эксперты і еўрапрактыкі.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Паўліна Савіцкая дала інтэрв'ю для беларускай телеперадачы „Самі пра сябе". ЗОРКА

Вершы Віктара Шведа

Страта

Плача сыночак прысеўшы ў куточак.
Са спачуваннем спытаў яго брат:
— Ці ты ад болю выплакваеш вочы,
Што бацька лупцоўку зрабіў акурат?

— Не плачу я над пакаранага лёсам,
Ужо боль цялесны цалкам прапаў.
У задняй кішэні я меў папяросы
І бацька лупцоўкай усе паламаў.

Сямейныя размовы

У гарадскім сустракаецца парку
Амерыканская моладзь з Нью-Йорка.
У ценю дрэваў пры сонцы яркім
аб сваіх сем'ях вядуць гаворку.

Усіх усцешыў дыспут Адама:
— Весела надта ў бацькоўскай хаце.
Маю трох татаў па першай маме,
Чатыры мамы па першым таце.

Міра Лукша

Вялікдзень

Вялікая Ноч запрамянілася
у Вялікі Дзень.
Цемра страты адмянілася,
адхіліўся цень.
Той, хто даў жыццё за нас,
у Небе сёння Пан.
Каб у душы агонь не згас,
свечку і я дам.
Гараць зорныя агні
знізу дагары.
Ты нас, Ойча, адмяні,
гора забяры.

Віктар Швед і „Роднае слова"

Атракцыёнам раённага конкурсу „Роднае слова" ў Беластоку была аўтарская сустрэча з Віктарам Шведам. Наш паэт святкаваў 78-годдзе. У гэты раз прачытаў ён свае творы і ахвотна адказваў на пытанні дзяцей.

— А, ці чыталі вы „Гары Потэра"? — пыталі дзеці.

— Прачытаў частку першага тома, але не закончыў. Быў затое на фільме, — адказаў паэт. Публіка спытала і пра кніжку Толкена „Уладальнік пярсценя". Віктар Швед прачытаў кніжку і глядзеў фільм.

— Чытаю ўсе навінкі, якія выходзяць у Беларусі для дзяцей і моладзі, — дадаў.

Да знаёмства з сучаснай маладзёжнай літаратурай падштурхоўвае дачушка Наталля. Дарэчы, Наталька выступіла ў конкурсе і заняла першае месца. Наталля дэкламавала верш Ларысы Геніюш „Лес".

На канец арганізатары „Роднага слова" — Валянціна Ласкевіч і Ян Сычэўскі, падарылі паэту букет руж.

Віктар Швед, у сваю чаргу, падзякаваў вучням, якія выступілі з яго вершамі. Усім удзельнікам паэт падарыў сваю „Вясёлку". Даравальны надпіс быў вельмі дарэчы:

Мы любім кроўнае Падляшша
Маленькую Айчыну нашу.
Свае палеткі і дубровы
На роднай усхваляем мове.

Сапраўды, 28 сакавіка г.г. у памяшканні ГП БГКТ у Беластоку сабралася больш за пяцьдзесят дэкламатараў. Дзеці і ўсе апошнія праспявалі паэту „Многае лета!" (гак)

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Паклоннікі вершаў Віктара Шведа з Беластока

Завяшчанне млынара

(французская казка)

У старога млынара было чацвёра сыноў. Не багаты ён быў, а ўсё ж чацвярых сыноў выгадаваў і, паміраючы, завяшчаў ім: старэйшаму — вятрак, сярэднім братам — пеўня і лесвіцу, а малодшаму — ката.

Жыць бы ім дружна ды пажываць, толькі не вельмі памяркоўным быў старэйшы брат. Як стаў гаспадаром ветрака, да братоў сваіх пачаў чапляцца, дакараць іх кавалкам хлеба. Не вытрымаў малодшы брат, узяў ката пад паху — усё багацце сваё! — і шчасця шукаць пайшоў.

Ці далёка, ці блізка, прыйшоў ён у такі край, дзе катоў зроду не бачылі. Паклікала яго ў дом адна добрая жанчына. Яна якраз кашу варыла сваім дзецям — усяго іх сямёра было, — а заадно і стомленаму падарожніку паесці прапанавала. Як толькі была згатавана каша, селі ўсе за стол і за лыжкі ўзяліся. Але тут раптам набеглі мышы, вялікая процьма, і на кашу накінуліся.

— Вось так кожны раз! — паскардзілася жанчына. — Ратунку ад іх няма! Хутка мы ўсе з голаду тут памром, калі не прыдумаем, як нам ад мышэй пазбавіцца.

— Не журыцеся, гэту бяду можна паправіць! — сказаў ёй малодшы брат і выпусціў на мышэй свайго ката.

Карта

Сама цікавае ў свеце гэта свет.

Цікава той свет паглядзець. Паехаць, пабачыць. Пажыць у свеце. З людзьмі пагаманіць. Гэта ўжо калі дарослы будзеш. Ды і цяпер Радзік мае свет перад вачыма. Расклаў аграмадную карту на падлозе, і так, і гэтак вандруе па свеце. Усім целам тую карту наведвае — паўзе, прыглядаючыся, уздоўж рэк да мораў, ад полюса да полюса, па мерыдыянах, і ўпоперак — па паралелях. Гэтую карту падарыў яму хросны бацька Алесь. Прывёз яе з замежжа. Моцная тая замежная карта, не рвецца ад такіх вандровак. Толькі надпісы на ёй на не зусім зразумелай мове. Радзік ужо ведае літары, нават і англійскія — яны зусім падобныя, толькі, вядома, чытаюцца, бывае, іначай. І канец тая Зямля на падлозе мае — паўзеш на захад — даходзіш да канца ліста. А калі б паўзці па агромным глобусе — дык, выпаўзаючы з Еўропы, дапоўз бы ў Амерыку, ага, па Атлантычным акіяне, так, як Калумб плыў на захад, думаўшы, што даплыве ў Індыю. А калі папоўз бы далей, за Амерыку, дык сапраўды, за Ціхім (ён жа і Вялікім называецца) акіянам, трапіў бы ў тую Індыю, што ў Азіі, на другім ужо паўшар'і...

Радзік злез з карты, пакруціў у руках маленькі глобус — так, як сапраўды наш зямны шар круціцца наўкол сябе, кожны дзень, а потым абабег бабулю, што ў мяккім крэсле пасярод пакоя вязала шкарпэтку на прутках.

— Бабуля, ты — Сонейка! Я цябе акружаю ў год!

Баба Зіна зняла акуляры.

— Што ты кажаш! — пажартавала з унука. — Відаць жа ж, што гэта Сонца наўкол зямлі ходзіць — раніцай устае, увечары...

— Бабуля! Капернік! — Радзік затрымаў сваю Зямлю ў размаханых руках і расплюшчыў шырока вочы.

— То ж і Капернік сам бачыў, што робіць сонца на небе! — працягвала жартаваць бабуля. — І хто там ведае з гэтых вашых вучоных, што там у сярэдзіне Зямлі — яе ж не разрэзалі. Кажаш, гарачае ядро? А скуль ім ведаць, якая там глыбіня ў акіянах?

Вывалак усхваляваны малеча з паліцы аграмадны атлас, расчыніў якраз на Вялікім акіяне. А там выразна размалявана і распісана, так як там, дзе суша — горы, даліны зялёна-карычнева-жоўтыя, з пікамі, тут на блакітным полі — таксама нізы глыбокія памечаныя. Дзе святлейшы блакіт, дзе цёмны. У тысячы метраў!

— Глядзі, бабуля! Ты не верыш?!

— Веру, веру, мой ты маленькі вандроўнічак, — з гонарам ды чуласцю пагладзіла ўнука па галаве бабуля Зіна. — Дык пачытай мне пра тое, што ў моры!

Міра Лукша

Мая вёска Семяноўка

Семяноўка заснаваная недзе да 1634 года. Князь Сямён Масальскі захоплены краявідам месца, у якім праходзіла мяжа паміж Ялоўскай, Свіслацкай і Лядзкай пушчамі, задумаў пабудаваць тут свой горад. Адразу ж загадаў ён сваім падданым высечы лес і ў самым цэнтры паляны пабудаваць вялікі двор. Пасля некалькіх месяцаў цяжкай працы ў планаваным месцы стаяў прыгожы будынак. Навокал яго пачалі пасяляцца людзі і на працягу нейкага часу паўстала вёска, якой не хапала толькі назвы. Жыхары, аднак, хутка справіліся з гэтай праблемай. На адным з агульных сходаў вырашылі „ахрысціць" яе Семяноўкай — ад імя яе заснавальніка.

У час калі вёска разбудоўвалася, у князя нарадзілася двух сыноў. Раслі яны хутка і князь задумаў падзяліць сваё багацце. Было гэта нялёгкае заданне, таму што трэба было падзяліць тэрыторыю разам з жыхарамі. Праблему гэтую вырашыла адна з суседак князя — Валянціна. У яе не было нікога блізкага і яна прадала князю свой маёнтак Семенякоўшчыну, які знаходзіўся непадалёк Семяноўкі. Князь гэты маёнтак падарыў аднаму з сыноў. Другому сыну засталася Семяноўка. Ад гэтага часу абедзве мясцовасці былі амаль неразлучнымі. Хаця ад моманту заснавання вёсак мінула шмат гадоў, гэтую неразлучнасць відаць і сёння.

Зараз Семяноўка вялікая вёска. У ёй пражывае 533 жыхары. Тут прыгожыя названні вуліц; назвы паходзяць ад поля, лугу, дрэў, школы. Вельмі прыгожая вуліца, якая пралягае з поўначы на поўдзень. Паўз яе стаяць драўляныя хаты, пабудаваныя простым сялянскім спосабам. Па вуліцы Школьнай стаіць цэнны помнік старадаўнасці — царква св. Юр'я XVIII ст. (на здымку) На мясцовым могільніку знаходзіцца новая мураваная капліца св. Панцялеймана, пабудаваная ў 1984 годзе. У Семяноўцы ёсць таксама Пачатковая школа, магазіны і святліца. На ўскраіне вёскі знаходзіцца мытня і вялікая чыгуначная станцыя, якая ў 1966-1992 гадах была „сухім портам" перагрузкі тавараў з Савецкага Саюза. Апрача гэтага сяло мяжуе з вадасховішчам „Семяноўка", якое з'яўляецца раем для турыстаў, рыбакоў, арнітолагаў, а таксама любіцеляў прыроды.

Семяноўка гэта вельмі прыгожая вёска, шкада толькі, што ўсё менш і менш тут дзяцей і моладзі.

Інфармацыі сабралі і апрацавалі
Таіса і Марцін Засімы

Польска-беларуская крыжаванка № 17

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванук н-р 3: Кухар, шар, акт, фара, апарат, аранж, іскра, актыў. Клас, тарка, рака, фанат, шарж, ара, пратэст. Узнагароды, **аўтаручкі**, выйгралі: **Юліта Давідзюк** і **Моніка Сямёнчык** з Дубін, **Раман Лушчынскі**, **Міхась Паплаўскі** з Бельска-Падляшскага, **Дамініка Каліноўская**, **Сільвія Лісавец** з Гарадка, **Агнешка Леўчук**, **Наталля Герасімюк** з Новага Корніна, **Эва Сегень** з Беластока. Віншуем!



Кот хутка з імі расправіўся: каго не з'еў, тыя разбегліся. Жанчына не ведала, як і дзякаваць юнаку.

— Так усё чыста і з'елі б, каб не ваш звярок слаўны.

— Што ж, бярыце яго ў падарунак. Вам ён больш патрэбны, а мне і так ні добра, ні дрэнна.

Каб аддзячыць за ката, усе жыхары вёскі чаго толькі ні падарылі слаўнаму юнаку, нават цэлы кашэль грошай сабралі. І вярнуўся ён дадому вельмі задаволены сваёй удачай.

— Бадай, і нам дома адседжвацца няма радасці, — вырашылі сярэднія браты. — Удача сама ў рукі не ідзе, трэба яе пашукаць!

Але старэйшы брат не адпусціў адразу абодвух братоў, і пайшоў шукаць шчасця той, каму ў спадчыну выпаў певень.

Ці далёка, ці блізка зайшоў, толькі застала яго ў дарозе ноч, і ён пастукаўся ў адзін дом наводшыбе вёскі, каб пераначаваць у добрых людзей.

— Толькі ведай, — сказалі яму гаспадары, — сёння наша чарга дзень сустракаць, так што падымацца нам рана давядзецца.

— Як гэта дзень сустракаць? — здзівіўся юнак.

— А вось як, — адказвае гаспадар. — Падымаемся мы зацемна, садзімся ў брычку і едзем на край поля дзень сустракаць. Як зоймецца золак, мы ў вёску вяртаемся і ўсіх будзім: прачынайцеся, маўляў, дзень прыйшоў!

— Вось дзівакі, — пасмяяўся другі брат. — Ды хіба няма ў вас пеўняў?

— Пе-ў-няў? — здзівіліся людзі. Тады юнак паказаў ім свайго пеўня.

— Кладзіцеся спакойна спаць, — сказаў ён, — мая птушка за вас дзень сустрэне і вам аб гэтым тройчы скажа. Вось на трэці раз і падымацца трэба.

Паверылі людзі, леглі спаць. А як пачало світаць, певень, вядомая рэч, як усе пеўні, закрычаў:

— Ку-ка-рэ-ку, дзень пачаўся!

А потым і другі, і трэці раз пракукарэкаў, калі сонца паднялося. А за ім услед і людзі прачнуліся. Падзякавалі юнаку за навуку і за дапамогу і ну прасіць, каб ён пеўня ім прадаў.

Шкада было юнаку са сваім пеўнем расставацца, але паспачуваў ён людзям і аддаў свайго пеўня. А тыя яго за гэта ўзнагародзілі чым Бог паслаў. І другі брат дадому таксама не з пустымі рукамі вярнуўся. Ды па дарозе трапіў ён у адно вельмі дзіўнае мястэчка, дзе вятрак высокі стаяў. А дзіўнае таму, што сяляне там ніколі нават не чулі пра лесвіцу, і адзін лез на спіну другому, каб наверх трапіць і адтуль мяшкі з зернем уніз перадаваць.

Вось вярнуўся другі брат дадому і расказаў аб гэтых дзіваках трэцяму брату, таму самаму, каму ў спадчыну лесвіца дасталася. А далей, нябось, самі здагадаецеся, што выйшла.

Словам, абжыліся тры малодшыя браты сякім-такім скарбам і самі добры вятрак пабудавалі. Весела ў ім колы круціліся, сам вецер падганяў яго крылы. А ў вясёлых братоў і збожжа саладзей, чым у пахмурага.

Праз нейкі час згалеў старэйшы брат і пайшоў па свеце бадзяцца і гараваць. Малодшыя браты яго да сябе клікалі, ды адмовіўся ён.

Фота ЕЖЫ САМУСІКА

Любімыя балоты

Будзе новая кніжка пра раку Нарву і яе людзей

Колькі навокал хараства...

О, Божа, колькі навокал хараства, а я сяджу ў бальніцы! Як можна марнаваць тут час, калі столькі цудоўнага дзеецца над Нарвай! — усклікае доктар Ежы Самусік, вядомы беластоцкі лекар, фізіятэрапеўт, а адначасова падарожнік і пісьменнік.

Так ён мне гаворыць, а я ж ведаю, што жартуе. І ўсім вядома, што гэта жарт, бо Ежы Самусік, загадчык аддзялення рэабілітацыі Ваяводскага шпіталя імя Янджэя Снядэцкага ў Беластоку, гэта перш за ўсё лекар.

Усё залежыць ад таго, па якой чалавек пойдзе дарозе. Бывае, што яго жыццёвы шлях ясны і роўны, без сукоў і завілін, без пытанняў, але, значыцца, і без адказаў. Але бывае і так, што на гэтай дарозе паяўляецца поўна адгалінаванняў, паваротаў і скрыжаванняў, а душа чалавека дасло́ўна вырываецца з цела.

Жыццё Ежы Самусіка гэта менавіта дарога другога тыпу. Доктар не мог пайсці па адной, гладкай дарозе, калі навокал было столькі цікавага, нязвыклага. Ад самага пачатку, ад маладосці яго займала не толькі медыцына, але і цягнуў нязведаны свет, манілі падарожжы, а ўсім тым, што ён убачыў, ён хацеў дзяліцца з людзьмі ў сваіх кніжках.

На працягу многіх гадоў свайго жыцця доктар Ежы Самусік не толькі ўліваў веру ў тых, што страцілі надзею пасля нешчаслівага выпадку ці цяжкой хваробы, не толькі лячыў іх, дапамагаў ім стаць на ўласныя ногі, прыстасавацца да жыцця ў новых умовах, не толькі імкнуўся „зрабіць" чалавека з чалавека, але і даваў людзям радасць, пераліваючы на паперу ўсё тое, што бачыў у часе падарожжаў па свеце, каб і яго чытачы, прынамсі ў іх уяўленні, маглі там пабываць, разам з ім.

Заўсёды доктару ўдавалася знайсці паплечнікаў, з якімі было яму па дарозе ў вандроўках па нязведаным — па бездарожжах у гарах, джунглях і пустыні, па далёкіх марах і акіянах. Спазнаць свет — гэта амаль таксама, як бы зразумець пакутуючага чалавека, пацыента. Бо свет свету няроўны. І больш у ім болю і крыўды, чым справядлівасці, ды і радасць на гэтым свеце не кожнаму дадзена.

А доктару радасць давала ўсё цікавае не толькі ў далёкіх, экзатычных краінах, але і паблізу сваіх родных мясцін, дзе падглядаў тутэйшы свет фауны і флоры, дзе аглядаў старыя царкоўкі і палацы, і пісаў пра ўсё гэта з вялікім знаўствам і заангажаваннем. Асабліва цікавілі яго, аднак, людзі, пражываючыя ўсюды, дзе ён пабываў.

Так выйшла з друку каля дваццаці кніжак пра Індыю, Непал, Афрыку, Еўропу, а таксама пра Беласточчыну — альбомы (супольна з жонкай Кацярынай Самусік) і мноства артыкулаў у прыродазнаўчых і датычных да помнікаў культуры і архітэктуры часопісах.

Нягледзячы на дасягненні ў навуковай і публіцыстычнай працы, доктар Ежы Самусік не спыняе сваіх пошукаў і здзяйсненняў. Якраз закончыў кніжку „Na himalajskich szlakach", яна яшчэ не выдадзена. Гэта ўжо будзе яго пятая кніжка аб Гімалаях Непала, дзе быў два разы — у восемдзесят сёмым і дзевяноста трэцім гадах. Штодзень вечарам сядае ён пры камп'ютэры і ажыўляе свае колішнія занатоўкі і ўспаміны.

У мінулым годзе доктар разам з жонкай Кацярынай зрабіў падарожжа па рацэ Нарве. Цяпер ён піша кніжку пра Нарву, у якой, як кажа, хоча спалучыць мясцовасці і падзеі, цікавых людзей, якія жывуць ці жылі над Нарвай — ад Семяноўкі на Беласточчыне да Зэгжынскага заліва пад Варшавай. Людзям з гэтых бакоў прысвячае ён найбольш увагі: гэта народны разьбяр Уладзімір Наумюк з Канюк, збіральнік прадметаў старыны Віктар Літвінчык з Суража, або памерлы ўжо вядомы аператар — назіральнік прыроды Уладзімір Пухальскі з Марусаў ці яшчэ старэйшы — этнограф Адам Хэнтнік з Навагрода.

Апрача славутых людзей, канстатуе доктар, ёсць шмат цікавых мясцін, цэркваў, касцёлаў, палацаў, паркаў, як хаця б Ломжынскі ландшафтны парк, Белавежскі нацыянальны парк і Нарвянскі нацыянальны парк, пра якія можна пісаць і пісаць. Пісаць пра тутэйшую фауну і флору, пра жыхароў прыпушчанскіх вёсак. У Навагродзе — пра цудоўны скансэн, пра вайсковыя ўмацаванні каля Ломжы.

У красавіку-маі выходзіць новы альбом „Dwory i pałace Podlasia", аўтарамі якога з'яўляюцца Кацярына і Ежы Самусік. Будуць там паказаны помнікі архітэктуры былых Беластоцкага, Сувальскага і Ломжынскага ваяводстваў.

Фота ЕЖЫ САМУСІКА

Летам жонка Кацярына збірае тут маліны

Любіць доктар пахадзіць па багнах з фотаапаратам у руках. Падглядае птушак, якія жывуць на балоце. А ці будзе альбом пра птушак? Не, гэта толькі для прыемнасці, смяецца доктар. Ёсць лепшыя, як хаця б Уладзімір Лапінскі з Брызгеля, Віктар Волкаў з Беластока, ці Павел Свёнткевіч, артапед з ПСК, які мае нават у Інтэрнэце сваю цудоўную старонку.

— Я чула, што ў вашай бальніцы збіраюцца звольніць каля ста асоб. Калі б Вам запрапанавалі звольніць некага з Вашага аддзялення, знайшоўся б такі чалавек? — пытаю на заканчэнне нашай размовы.

— Я б звольніў толькі сябе, — адказвае мне доктар. — Усе іншыя тут вельмі патрэбныя.

Ада Чачуга

Балканскія войны

У выдавецтве „Orthdruk" паказалася кніга Антонія Гізы і Кшыштафа Філіпава *Балканскія войны 1912-1913*. Яе прамоцыя адбылася ў Цэнтры праваслаўнай культуры ў Беластоку.

Тэма кнігі кранае найбольш вядомыя, але і найбольш складаныя падзеі ў гісторыі Паўднёва-ўсходняй Еўропы мінулага стагоддзя. Войны 1912 і 1913 гадоў былі барацьбой саюзнікаў: Балгарыі, Сербіі, Грэцыі і Чарнагорыі супраць Турцыі. Змагаліся за вызваленне балканскіх зямель, якія знаходзіліся пад атаманскім панаваннем. Мелі яны характар вайны за тэрыторыю, без аглядкі на жыхароў гэтых зямель.

Аўтары пры пісанні гэтай працы выкарысталі багатыя крыніцы расійскія, з балканскіх краін і нешматлікія выданні на гэтую тэму, якія былі выдадзены ў Польшчы, а таксама англамоўныя. Балканскія войны праводзіліся амаль дзевяноста гадоў таму, але іх вынікі балюча адціснуліся на доўгія гады, асабліва на балгарскім народзе ў Македоніі. Македонія, замест апынуцца ў рамках балгарскай дзяржавы, была падзелена паміж пераможныя ў другой балканскай вайне краіны, г.зн. паміж Сербію і Грэцыю. Жыхары, якія пражывалі на гэтай тэрыторыі, далі сябе пазнаць як найбольш каштоўны і патрыятычны элемент, — пішуць аўтары кнігі. Дадаюць прытым, што праблемы, узніклыя ў выніку балканскіх войнаў, усё актуальныя, перш за ўсё ў Грэцыі і, не-

залежна ад свае балючасці для балгарскага народа, ёсць малыя шанцы на змену становішча. Ёсць, аднак, шанц нармалізацыі і балгарска-македонскага збліжэння.

„Балканскія войны" ўзбагачаны прыватнымі здымкамі з архіваў аўтараў. Ёсць тут фатаграфіі м.інш. балгарскіх рэвалюцыянераў Дам'яна Груева і Георгія Дэлчэва ды балгарскага нацыянальнага героя Івана Міхайлава.

Кнігу можна набыць у Цэнтры праваслаўнай культуры ў Беластоку, па вул. Св. Мікалая, 5. (холм)

Antoni Giza, Krzysztof Filipow, *Wojny bałkańskie 1912-1913 roku. Aspekty polityczne i militarne (początki niewoli Bułgarów w Macedonii Egejskiej i Wardarskiej).* Orthdruk 2002, ss. 104.

Фільмавы вечар

Красавік — у апошнім часе здзіўляе сваім надвор'ем. Але гэта не прычына, каб вечарам сядзець дома перад тэлевізарам. Запрашаю ў кіно. На гэты тыдзень прапаную тры фільмы.

„Банды Нью-Йорка" (*Gangs of New York*) у рэжысуры Марціна Скарсезе з Леанардам Ды Капрыё, Дэніэлам Дэй-Люісам і Камеран Дыяз у галоўных ролях, гэта прапанова для аматараў дэтэктыўных фільмаў, акрашаных любоўным матывам.

На Манхатане, у трагічных умовах пражываюць кланы ірландцаў, якія толькі што прыехалі ў Амерыку. Каб пражыць і дасягнуць нейкай пазіцыі, прымушаны яны сутыкнуцца ў барацьбе з пратэстантамі, якія ненавідзяць „новых". Правадыр ірландцаў вядзе сваіх пабрацімаў у бой, які канчаецца для яго трагічна — гіне ён на вачах свайго 7-гадавога сына, а ўлада ў горадзе дастаецца ў рукі Біла, які пастанаўляе выхаваць сына свайго праціўніка. Хлопец, помнячы словы бацькі, што кроў трэба адпомсціць крывёю, плануе помсту і калі паяўляецца ў яго жыцці маладая зладзейка, якая таксама падабаецца Білу, сітуацыя становіцца трагічнай.... А што было далей, пабачце самі!

„Любоў з паведамленнем" (*Two Weeks Notice*) аўтарства Марка Лоўранса — гэта рамантычная камедыя, а ў галоўных ролях пабачым Сандру Балак і Г'ю Гранта.

Маладая юрыстка з Гарварда працуе бясплатна для бедных людзей. Люсі, бо так яна называецца, займаецца аховай асяроддзя і помнікаў архітэктуры. Аднойчы сустракае на вуліцы Джорджа — мільярдэра і ўладальніка будаўнічай фірмы, якая не звяртае ўвагі на экалогію. Абсмяяць Джорджа не ўдалося, бо той пастанавіў „замкнуць вусны" дзяўчыне і запрапанаваў ёй працу ў сваёй фірме, але гэта быў толькі пачатак. Чаго? Даведайцеся самі! Падкажу толькі, што ад нянавісці да любві толькі адзін крок!

На канец прапанова для наймалодшых кінааматараў і іх бацькоў. „Панесеныя прывідамі" (*Spirited Away*) — гэта японская казка аб 10-гадовай дзяўчынцы, якая разам са сваімі бацькамі шукае новага дому. Не знаючы ваколіцы, героі заблудзілі і ў цёмным лесе трапілі на цудоўны ўзгорак, на якім раскінуўся пусты пасёлак. Бацькі, здарожаныя і галодныя, пабачыўшы на сталах ежу, сталі жадна есці, аднак па хвіліне перамяніліся ў вялікіх свіней. Аказалася, што сям'я папала ў пасёлак духаў. Каб памагчы бацькам, дзяўчынка прымушана выканаць шэраг небяспечных заданняў, у якіх праверыць свае магчымасці і пакажа сапраўдную вартасць любві. На экране пабачым цмокі, якія будуць уцякаць ад папяровых птушак і шэраг іншых дзіўных стварэнняў.

Паўліна Шафран

Хрыстос уваскрос

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Вынас плашчаніцы ў Орлі

Няма важнейшай урачыстасці ў жыцці хрысціянства і няма ў зямным жыцці большай радасці чым радасць ад Уваскрэсення Збавіцеля — падкрэсліваецца ў Праваслаўнай царкве. У адрозненне ад Каталіцкага касцёла праваслаўнае свята Уваскрэсення называецца Пасхай Хрыста або Светлым Хрыстовым Уваскрэсеннем. Яно называецца сэрцам усегадовага літургічнага цыкла — святам свят і ўрачыстасцю ўрачыстасцей.

Паводле юліянскага календара Велікоднае свята сёлета выпадае 27 і 28 красавіка — тыдзень пасля свята паводле грыгарыянскага календара, якім карыстаецца заходняе хрысціянства. Да XIV ст. так каталіцкі, як і праваслаўны Вялікдзень выпадаў дакладна ў той самы час. Разыходжанні ўзніклі тады, калі Каталіцкі касцёл увёў новы грыгарыянскі каляндар. З тае пары адначасны Вялікдзень выпадае рэдка; найчасцей бывае ён тыдзень пасля каталіцкага, а бывае і два-чатыры тыдні пазней.

Прынцып вызначання даты Вялікадня быў прыняты Першым Усяленскім саборам у Нікеі ў 325 годзе, згодна якому нядзеля пасля першай вясенняй поўні пасля (ніколі раней) яўрэйскай Пасхі з'яўляецца велікоднай нядзеляй.

Велікодную радасць папярэджвае саракадзённы перыяд Вялікага посту, які — як і ў каталіцкай рэлігіі — рыхтуе праваслаўных вернікаў да пасхальнай містэрыі. Вялікі пост завяршае Вялікі тыдзень, які пачынаецца Вербнай нядзеляй у памяць Гасподняга ўваходу ў Іерусалім.

Найважнейшыя ўрачыстасці пачынаюцца ў Вялікі чацвер. Вечарам у храмах чытаюцца дванаццаць вытрымак з Евангелляў аб пакутах Хрыста, пасля якіх хор спявае ўрачыстыя песні, у іх ліку „Разбойнік". Вернікі ў той час трымаюць у руках запаленыя свечкі, якія пасля набажэнства стараюцца данесці разам з агнём дадому; паводле павер'яў данесены агонь мае гарантаваць поспехі на цэлы год.

У Вялікую пятніцу — у час строгага посту — на сярэдзіну храма выносіцца плашчаніца з выявай Хрыста пакладзенага ў труну, пасля чаго вернікі прыкладаюцца да яе і цалуюць. Набажэнства пакланення перад плашчаніцай пачынаецца пасля абеду і працягваецца да позняга вечара.

У Вялікую суботу бацюшка пасля богаслужэння едзе ў аддаленыя вёскі пасвяніць там пасху: яйкі, мяса, печыва і іншыя стравы. Здавён-даўна святары прыходзілі свяніць пасху ў хаты і не былі гэта адно сімвалічныя колькасці ежы, якой павінна было хапіць на цэлы тыдзень. У той дзень мянялася таксама літургічнае прыбранне храма з чорнага на белае. Увечары пачынаецца набажэнства завяршаючае святкаванні Вялікага тыдня.

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Вялікдзень у Міклашах

Галоўная велікодная ўрачыстасць пачынаецца роўна ў поўнач з суботы на нядзелю. Перад плашчаніцай, якая знаходзіцца пасярэдзіне храма, правіцца ютрань, якую называюць іерусалімскай. Вернікі ўпоцемку смуткуюць аб Хрыстовых пакутах; паўторнае прышэсце Хрыста мае наступіць менавіта ў пасхальную ноч. Апоўначы найважнейшы святар заносіць плашчаніцу ў алтар і гэтая падзея абазначае канец Вялікага посту.

Пачынаюць біць званы і вернікі выходзяць з храма на хрэсны ход а за імі зачыняюцца дзверы царквы. Шэсце вернікаў тройчы абыходзіць храм, пасля чаго святар знакам крыжа адчыняе дзверы ў царкву, якія будуць адкрыты ўвесь тыдзень — гэта сімвал адкрыцця дзвярэй у рай людзям дзякуючы смерці і ўваскрэсенню Хрыста. Ужо ў царкве бацюшка словамі „Хрыстос уваскрос" аб'яўляе радасную навіну аб уваскрэсенні Госпада, а вернікі тройчы адказваюць „Сапраўды ўваскрос". Адначасна жадаюць яны ўзаемна поспехаў, тройчы цалуюцца, сімвалізуючы дараванне крыўдаў. Пасля літургіі, якая канчаецца каля шостай гадзіны раніцы, бацюшка свенціць пасху ўсім прысутным вакол царквы вернікам.

Цэлы тыдзень пасля Вялікадня называецца Светлым тыднем і гэты перыяд лічыцца часам прысутнасці Хрыста ў сваёй Царкве. Доказам радасці ад Уваскрэсення з'яўляецца забарона кленчыць і біць паклоны. Кожны дзень вернікі павінны адзначаць Уваскрэсенне пачынаючы сама менш з малой літургіі і частуючы блізкіх пасвенчанай ежай.

У велікодны перыяд надзвычайна падкрэсліваецца лучнасць жывых з памерлымі. У трэці дзень свята вернікі пасля выхаду з храма наведваюць магілы блізкіх і паведамляюць іх аб уваскрасенні Хрыста, запальваюць свечкі. Ад свята пачынаецца саракадзённы велікодны перыяд, у час якога вернікі вітаюцца словамі „Хрыстос уваскрос".

Паводле царкоўнай традыцыі першыя шлюбы могуць адбывацца не раней чым тыдзень пасля Пасхі, затое вельмі папулярнымі ў той час становяцца хрысціны.

Міхал Мінцэвіч

Духоўнасць велікапоснага спеву

У царкве Успення Прасвятой Багародзіцы ў Бельску-Падляшскім з 31 сакавіка па 3 красавіка адбыліся канцэрты царкоўнай велікапоснай музыкі, арганізаваныя іерэем Пятром Снарскім. Выступілі ў іх хоры Бельскага і Нарваўскага дэканатаў.

У час адкрыцця і закрыцця мерапрыемства з духоўнымі настаўленнямі выступіў епіскап Бельскі Грыгорый.

— Велікапоснае спяванне адкрывае і адраджае душу. Радуе яе і прыбаўляе духоўнай сілы, — заявіў уладыка. — Пост і малітва патрабуюць намаганняў, а для спявання не трэба асаблівага напружання.

У першы дзень выступілі царкоўныя хоры з Орлі, Боцькаў і прыхода Успення Прасвятой Багародзіцы ў Бельску-Падляшскім. Самы высокі мастацкі ўзровень паказаў бельскі хор, якім кіруе Ірынней Лаўрашук. Спяваюць у ім, перад усім, вучні гімназічных і сярэдніх школ, якія дабіліся поспехаў на фестывалях царкоўнай музыкі. Добры ўзровень паказалі таксама прыхадскія хоры з Боцькаў і Орлі. Сярод харыстаў з Боцькаў былі вучні, студэнты і пажылыя людзі, а ў арлянскім хоры пераважалі людзі ў сярэднім узросце. Хоры з прыходаў у Падбеллі, Кленіках, Шчытах і Пухлах звярнулі ўвагу на духоўнасць велікапоснага спеву. Песні напаміналі аб грахоўнасці і вінаватасці перад Богам, выклікалі настальгічны настрой.

— Выступленне патрабуе ад харыстаў вялікай адказнасці і адвагі. Спеў у час посту — гэта падзяка за Божую дапамогу. Я арганізую канцэрты, як ахвяру за маё выздараўленне, — сказаў іерэй Пётр Снарскі. — Ладзім спатканні з царкоўнай музыкай, каб нашы харысты, якім цяжка трапіць на Фестываль царкоўнай музыкі ў Гайнаўку, убачылі, што аб іх думаюць.

Аляксей Мароз



Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Хор прыхода Нараджэння Прасвятой Багародзіцы ў Бельску-Падляшскім

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Хор прыхода ў Пухлах

Спаглядаючы на пажаўцелую фатаграфію

У школу паслалі мяне ў сем гадоў. Было гэта ў 1947 годзе. Вучыўся я ў Чаромсе, паколькі ў Кузаве не было школы. Заняткі праводзіліся ў прыватных кватэрах. Адна школа знаходзілася каля млына Раеўскага, у Верамюковай хаце, а другая — на Пясках, за касцёлам. Кузаўцы хадзілі ў тую, што каля Раеўскага была. Кіраўніком школы быў Возьны (імя не запамяталася). Ягоная жонка таксама вучыла і была маёй выхавацелькай. З настаўнікаў памятаю „бабцю" Сахацкую, якая навучала рускай мове. З першага класа вучылі рэлігіі — з Кляшчэляў прыязджаў бацюшка. Возьны быў строгім для вучняў. Як паглядзеў з-пад густых броваў, дык мурашкі па спіне праходзілі. Вучняў, якія правінаваціліся, у канцылярыю выклікаў, загадваў класціся на даўжэзны столак ды нагавіцы спускаць і тады ўрэзваў гумовым бізуном некалькі „гарачых", што скура сціналася.

У школу хадзілі дарогаю, якая праходзіла цераз пераезд за паравозным дэпо, або чыгуначнай станцыяй. Напрасткі бліжэй было, але праз пуці ахоўнікі чыгункі не дазвалялі праходзіць. Мы паміж вагонамі прабягалі. Як кагосьці злавілі, дык на вартоўню вадзілі. Бацькі штраф плацілі. З першага класа я пасябраваў з Аляксандрам Рэпкам, які непадалёк у вёсцы жыў. У школу разам хадзілі, урокі супольна рашалі. Для мяне Алесь партнёрам дзіцячых гульняў стаў. У летні час мы ў іхнюю стадолу зашываліся і на духмяным сене спалі. Аднойчы са школы чарадой вярталіся. Калі праз пуці праходзілі, дык на ахоўнікаў наткнуліся. У распалох кінуліся (яны нас быццам паляўнічыя зайцоў ганялі). Алесь у семафорныя правады ўбіўся, калені пакалечыў. Вартаўнікі яго схапілі і на вартоўню завялі. Бацька прыяцеля пуцявым майстрам быў. Справу з камендантам аформіў, на ахоўнікаў скаргу падаў за тое, што сын пакалечыўся. З таго часу не лавілі нас.

Праз два гады ў школу каля Раеўскага хадзіў. Затым на Пясках вучыўся. Непадалёк стаў знаходзіўся. Зімою на лёд хадзілі коўзацца. У летні час „у арэнду" запускаліся, бо побач става яблыні раслі. Ад пятага класа вучыўся ў бараку, які са станцыі перавезлі і паставілі побач дарогі, дзе зараз знаходзіцца прадуктовая крама Ніны Гапанюк. Раней у ім пагранічнікі жылі. У Чаромху калісьці нельга было без пропуска прыехаць. Пероны былі агароджаны, а пры выхадзе на станцыю пагранічнікі дакументы правяралі. З гэтага часу я запамятаў кіраўнічку школы Станіславу Ратыняк і настаўнікаў: Марыю Шостак, Мікіту Карповіча, Галіну Федзюкевіч і Ларысу Шпаковіч. Гэтая апошняя гімнастыкі вучыла і лічылася самай малодшай па ўзросце настаўніцай. Як у сёмым класе былі, дык наш сябрук Васіль Баранаў за ёю аглядаўся. Пад гальштукам у касцюме прыходзіў. Мы іх нарачонымі называлі. Марыя Шостак вучыла польскай мове і гісторыі, Мікіта Карповіч матэматыкі і рускай мове, а Станіслава Ратыняк — біялогіі. Карповіч з суседніх Хлевішчаў выводзіўся. Мы яго не баяліся, бо казалі, што гэта пан з вёскі. Да вучняў акуратна ставіўся. Ад кожнага ведаў патрабаваў. Хто ўрока не вывучыў, дык на калені ставіў на шлаку перад школай (насупраць класа) ды гаварыў: „Калі не хочаш вучыцца, дык у царкву ідзі. Пастаў Богу свечку, бярыся за цэп і малаці грэчку". Ратынякова нервовай была. Аднойчы на ўроку пеналам у вучня шпурнула. Амаль вока хлопцу не выбіла. Спалохалася моцна. Прасіла, каб ніхто бацькам аб тым не гаварыў. Найлепш я любіў урокі Марыі Шостак. На экзамене ў сёмым класе па яе прадмеце выдатныя ацэнкі атрымаў.

— Падавайся ў педагагічны ліцэй, — гаварыла пані Шостак. — Настаўнікам будзеш.

Сёмыя класы раздзяляліся на „а" і „б". Мы з Алесем Рэпкам у „б" класе вучыліся. У адным класе з намі вучыліся аднагодкі з Вулькі-Тэрахоўскай, Ставішчаў і Беразышчаў. Сцяпан Рошчанка са Ставішчаў быў нізкага росту. У першай парце сядзеў. Аляксандр Рэпка, Віктар Кузуб і Міхал Русін — на апошняй, бо самымі рослымі былі. Я сябраваў найбольш з Васілём Баранавым, Віктарам Гірыным, братамі Кульваноўскімі — Аляксандрам і Лёнікам, ды братамі Кубіцкімі — Янам і Эдзікам з „а" класа.

Найбольш наша кампанія ў Васіля Баранава вольны час праводзіла. У яго бацькоў быў сад і мы яблыкамі ласаваліся. Васіль марыў стаць мараком, падпісваўся на часопіс „Morze". Пасля заканчэння сёмага класа падаў заяву ў Марскую школу. Адмовілі па стане здароўя. Паступіў у Чыгуначны тэхнікум і паспяхова яго закончыў. Пасля лячэння міндалінаў зноў стаў на лекарскую камісію, каб здаць экзамен у марскую школу. Прынялі. У рэзультаце стаў капітанам дальнамарскога плавання. Віктар Гірын стаў афіцэрам Войска Польскага, на пенсію адышоў у чыне палкоўніка. Лёнік Кульваноўскі зараз пенсіянер-настаўнік. Яго старэйшы брат Аляксандр памёр. Сцяпан Рошчанка пражывае ў Беластоку. Не давялося мне з ім сустракацца. Янка Кубіцкі і Алесь Рэпка сталі, як і я, чыгуначнымі пенсіянерамі. Апошнія з кампаніі раз'ехаліся па свеце. Эдзік Кубіцкі, напрыклад, зялёную карту выйграў і выехаў у Амерыку. Пасля пяцігадовага пражывання ў ЗША ў Чаромху вярнуўся. Паколькі яго штат у вагонным дэпо прызначылі іншаму, а яму не далі працу, дык у Амерыку вярнуўся.

Калі паглядаю зараз на пажаўцелую фатаграфію са школьных гадоў, дык усё нанава ажывае. Але мы ўжо не бестурботныя хлапчукі. Пасталелі, сем'ямі абзавяліся, унукаў дачакаліся. Можам адно зараз паўспамінаць ды дзеткам расказваць, як калісьці ў школу хадзілі.

Уладзімір Сідарук

Фота з архіва аўтара

Стаяць злева направа: Яніна Міклашэвіч, Уладзімір Сідарук (аўтар), Лявон Кульваноўскі, Марыя Рошчанка, Дзмітры Назарук (памёр), Віктар Гірын, Васіль Баранаў, Галіна Міклашэвіч і Сцяпан Рошчанка. Спераду настаўніцы — Ларыса Шпаковіч і Галіна Федзюкевіч

Выратаваў ад смерці

Мікалаю споўнілася сем гадоў, калі гітлераўская Германія напала на Савецкі Саюз. Ён добра помніць, як у нядзельную раніцу нямецкія самалёты бамбілі мястэчка Заблудаў і распачатую будову лётнішча, а рускія салдаты гаварылі, што гэта манеўры. У аўторак каля абеду з'явіліся ў нашай вёсцы нямецкія салдаты на машынах і матацыклах. Жаўнеры з закасанымі рукавамі раздавалі дзеткам шакаладкі і цукеркі, а старэйшым жыхарам казалі, што за тры дні „Москаў капут", але і праз тры гады не змаглі разграміць Маскву.

Помніць добра Мікалай першыя вывазы на прымусовыя работы ў Нямеччыну, як немцы загадалі цэлым сем'ям пагрузіцца на вазы, узяць неабходнае і ехаць у міхалоўскую гміну, а дабытак і ўсё астатняе аставіць. Потым забіралі моладзь на прымусовыя работы. З нашай вёскі Бялкі, — кажа Мікалай, — пазвалі многа моладзі ў гміну. А калі яны там з'явіліся, дык іх адразу за драты, а пры ўваходзе яшчэ лупцавалі дубінкамі. Пасля ночы іх пагрузілі ў самаходы ды павезлі ў лагер за драты, у Супрасль. Там яны сядзелі больш тыдня; многа адтуль уцякло, таксама з нашай вёскі. Пасля прыязджалі за імі немцы, але моладзь хавалася, а бацькі гаварылі, што яны не вярнуліся.

— Помню добра, — успамінае Мікалай, — як уначы з 13 на 14 кастрычніка, перад святам Пакровы, акружылі немцы вёску, палавілі ўсіх уцекачоў ды павезлі ў Нямеччыну. Прыгадалася такое здарэнне. Яшчэ дзень да прыезду немцаў пачуў быў Мікалай, як сусед гаварыў немцу, што адна маладая дзяўчына, Манька, якая ўцякла з Супраслі, схавалася ў бацькавай клуні пад снапамі, а яе бацька малоціць цэпам жыта. Пачуўшы такое Мікалай пабег дахаты і расказаў усё сваёй старэйшай сястры. Яна хуценька выправіла Мікалая, каб паведаміў дзядзьку Дзмітрыя аб небяспецы, якая пагражае Маньцы. Прасіў Мікалай, каб хутчэй уцякала, бо неўзабаве немцы прыедуць шукаць яе. Раскрылі Маньку з-пад снапоў і яна ўцякла. Немцы прыйшоўшы ў стадолу выкінулі ўсё жыта на ток, заставілі толькі апошні радок і ў кожны сноп калолі штыкамі. А калі там Маньки не знайшлі, моцна пабілі яе бацьку, але астаўся ён у жывых. Аднак ёй не пашанцавала. Немцы зрабілі аблаву на моладзь і разам з усімі забралі і Маньку ды павезлі ў Кёнігсберг. Працавала яна ў баўэра, а многія — у фабрыках.

Пасля вайны вярнулася Манька дамоў. Паколькі яе бацькі жылі бедна, на чацвяртушцы зямлі, пайшла яна шукаць працу ў горад. Уладкавалася ў Беластоку, выйшла замуж за Пецьку з Пяшчанікаў. Нарадзілася ў іх двое дзетак. Жылі па вуліцы Слонімскай, каля гарадской лазні. Стаіць яшчэ той дом. Часта туды заходзіў Мікалай і там начаваў. Потым Пецька распіўся, яго былі выкінулі з працы. Знайшоў ён сабе другую жанчыну, а Маньку пакінуў з дзеткамі. Як дала рады, так даглядала дзетак, каб выраслі на добрых грамадзян. Памёр Пецька, а Манька знайшла сабе другога мужа Вітака і нарадзіла яшчэ адно дзіця. Атрымалі жыллёвую кватэру каля кааператыва невідучых. Пад акном у іх расла сліва і туды часта заходзіў Мікалай. Вітак заўсёды дзякаваў Мікалаю за тое, што выратаваў жонку ад смерці. Памёр і Вітак. Маньцы цяпер гадоў пад 80, жыве адна, а Мікалаю — гадоў пад 70. Бачыў яе апошні раз больш за тры гады назад, калі прыехала ў родную вёску Бялкі на паховіны свайго дваюраднага брата. Кажа Мікалай, каб ведаў дзе цяпер пражывае Манька, наведаў бы яе ды разам паўспаміналі б мінулае.

Мікалай Лук'янюк

Ванька, вярніся!

Жыў у адной вёсцы Іван і ў час нямецкай акупацыі яго забралі на прымусовыя работы ў Нямеччыну; трапіў ён на чыгунку ў горад Кёнігсберг. Там трэба было працаваць, але ён не хацеў рабіць на ворага і калі хадзіў у прыбіральню за сваёй патрэбай, дык праседжваў там прынамсі гадзіну. Калі выходзіў, дык знерваваны нямецкі жандар заўсёды дубасіў яго канчуком аж рэха ішло, але наш герой не здаваўся і пакорліва пераносіў гэта. Пасля вызвалення трапіў ён у савецкае войска. У час баёў ён узяў салому і падпаліў нямецкі танк, які згарэў разам з экіпажам; за такі цуд Сталін павінен быў прысвоіць яму геройскае званне. Пасля Іван трапіў у Маньчжурыю і як ён там змагаўся з японцамі — ніхто не ведае. Вядома толькі, што ў Расіі пакахаў ён з узаемнасцю прыгожую Кацюшу. Да вяселля, аднак, чамусьці між імі не дайшло і калі ён ад'язджаў ужо поездам у Польшчу, дык тая Кацюша бегла за цягнікам ажно тры кіламетры і крычала:

— Ванька, вернись!

— Прощай, дорогая! — махаў ён ёй рукою.

Ванька пасля быў у вёсцы солтысам.

Мікалай Панфілюк

На пагонах чорных

У 10 нумары „Нівы" апублікаваны быў мой верш „Вёскі праваслаўныя". У перадапошняй страфе верша згадваюцца „на пагонах чорных літары «эсвэо»". Гэты фрагмент верша выклікаў пытанні чытачоў, якія хочуць ведаць, якія падпольныя падраздзяленні карысталіся такой сімволікай.

Адказваю, што чорныя пагоны, паколькі я ведаю, насілі атрады Нацыянальных узброеных сіл (NSZ), а на іх былі літары SWO — абрэвіятура словазлучэння „смерць ворагам айчыны". Не ведаю ці іншыя ўзброеныя групоўкі, ці асобныя людзі самавольна не карысталіся такімі пагонамі і іншымі эмблемамі, як хаця б рынграфамі з выявай Божай Маці.

Васіль Петручук

Адгалоскі

Аб аспекце еўрапейскім

У 8 нумары „Нівы” паявіўся артыкул „Азіяцкі аспект”, які прымушае насцярожыцца, бо такім словам вяльможы даўней называлі ўсё адсталае і неразумнае. Але цяпер мы бачым, што такая азіяцкая краіна, як Японія — у тэхніцы раўняецца з ЗША. Трэба прызнаць, што ўпамянутыя ў артыкуле аўтары У. Сідарук, Я. Мірановіч і М. Панфілюк пішуць артыкулы з пункту гледжання сваіх супляменнікаў і яны бліжэй праўды. У вышэй названым артыкуле мы чытаем такія канстатацыі: „ЗША заснавалі выхадцы з асветніцкай Еўропы не як нейкае царства, але як дзяржаву, якая прадстаўляе інтарэсы грамадзян (...) і што мы не бачым і нават не хочам бачыць таго, што ўлада за акіянам дбае пра сваіх грамадзян, не перашкаджае і дзейнічаць дзеля свайго дабра”. Наіўнасць! У адкрытую Амерыку хлынулі розныя сволачы і прайдзісветы, выразалі там, атруцілі алкаголем, распустай і знішчылі ўвесь індзейскі народ, заваладалі яго багаццем і землямі. Толькі нікчэмныя рэшткі асталіся ў рэзервацыях. Сарганізаваны бы ў і гандаль рабамі, а таргоўлю неграмі сарганізаваў ніхто іншы, як каталіцкі манах Лас Камзас! У Афрыцы былі створаны рынкі рабоў, арганізаваны былі цэлыя паходы, каб лавіць неграў і прадаваць іх у Амерыку. Везлі туды ў нетрах караблёў без ежы і медыцынскай дапамогі. І гэта агульнавядомая праўда. Хопіць прачытаць аповесці „Пятнаццацігадовы капітан”, ці „Хату дзядзі Тома”. У першай сусветнай вайне ЗША вельмі пабагацелі на ваенных пастаўках. У другой сусветнай вайне яны мелі абавязак як найхутчэй стварыць другі фронт, чаго чакалі мільёны вязняў канцлагераў. І каб гэта зрабіць, яны мелі аграмадныя ваенныя, матэрыяльныя і людскія рэсурсы. Але яны доўга ваявалі толькі супраць нямецкіх жанчын, дзяцей і старэчаў і высадзіліся ў Францыі толькі 6.06.1944 г., калі лёс вайны ўжо быў вырашаны на ўсходнім фронце. Праўда і тое, што ЗША маюць вялікія дасягненні ў галіне развіцця прамысловасці, навукі і тэхнікі. Яны пасля апошняй вайны вывезлі найлепшых нямецкіх інжынераў і вучоных; першыя амерыканскія ракеты і спадарожнікі Зямлі будаваў нямецкі інжынер Вернер Браун (1912-1977).

Перад апошняй вайной польскае грамадства так кахала Англію і Францыю, як цяпер кахае ЗША, хаця мела прыклады з гісторыі, што любоў была без узаемнасці. Захад не памог палякам ні ў 1794 годзе, ні ў 1831, ні ў 1863 гадах. Не паварушылі нават пальцам англічане і французы ў 1939 годзе. А маглі памагчы: мелі мабілізаваную загадзя армію, англа-французская авіяцыя была роўнай нямецкай авіяцыі, мелі ў два разы перавагу ў артылерыі, амаль такую ж перавагу ў танках — 4 800 танкаў, немцы толькі 2 800, а франка-англійскі ваенны флот быў 9 разоў мацнейшы за малы нямецкі флот. Аднаго толькі яны не мелі: не мелі ахвоты змагацца за Гданьск. Не жадалі англа-амерыканцы своечасова памагчы і Савецкаму Саюзу, бо хацелі, каб ён абяскрывавіўся.

А што мы ведаем пра іракскага Гусейна? Амаль нічога. Да нас даходзіць толькі тое, што скажа амерыканская прапаганда і яе некрытычныя паслядоўнікі. Амерыканцы разбурылі Афганістан і яго слабую эканоміку, разбамбілі Сербію. Цяпер ЗША прыдзіраюцца да Ірака. Які Гусейн, мы не ведаем, але напэўна іншы, чым мы і іншы, чым амерыканцы, бо ён вырас і жыве ў іншым, мусульманскім свеце, значыць ацэньваць яго можа толькі іракскі народ, а не заакіянскія разбуральнікі. Насоўваецца тут пытанне, хто даў ЗША права судзіць, хто на свеце з’яўляецца „добрым” правіцелем, а хто „благім”. Але ўсё, што добрае для ЗША, не заўсёды добрае для Азіі і не заўсёды добрае для Еўропы. У ЗША могуць грызціся ў парламенце, бо яны не маюць пасуседску канкурэнтаў, а ў Еўропе грызня на вярхушцы можа аслабіць дзяржаву, што могуць выкарыстаць суседзі. ЗША зацікаўлены ў тым, каб іншыя дзяржавы былі слабымі ўнутры, каб зрабіць з іх сваіх васалаў. А і іракская нафта, ох як пахне амерыканскім бізнесменам!

Калі чалавек любіць сваю краіну, сваіх супляменнікаў, іх веру, абычаі і г.д., дык такое можна лічыць нармальным. Але калі людзі больш любяць далёкія і чужыя ЗША, чым сваю краіну і сваіх супляменнікаў, то такое нармальным лічыць нельга. А ў Польшчы такіх ненармальных асобеняў нямала, хаця яны павінны ў гісторыі прыкмеціць, што іх любоў да абажаемага Захаду ніколі не абярнулася ўзаемнасцю. Таму давайце будзем любіць сваіх супляменнікаў і адзінаверцаў і жадаць, каб ЗША перасталі бамбіць другія народы, саджаць свой нос у справы іншых народаў, перасталі зброіцца, бо іх палітыка можа давесці да сусветнай катастрофы. А нас хай пакінуць спакойна жыць у нашай старой, але ўсё-такі мілай Еўропе.

Мікалай Капчук

Заўвагі да артыкула „Азіяцкі аспект”

У артыкуле ,,Азіяцкі аспект” Аляксандр Вярбіцкі параўноўвае сітуацыю 1938 года вакол Гітлера з цяперашняй сітуацыяй у Іраку. Трэба памятаць, што Германія мела тады магутную армію, а Англія і Францыя не былі гатовыя да вайны і таму ўступілі дыктатару. Германія ўжо тады заняла Аўстрыю і жадала захапіць Судэты ў Чэхаславакіі. Ці такую моцную армію мае Ірак, што пагражае бяспецы такой магутнай дзяржавы як ЗША? Ці Ірак цяпер жадае заняць суседнюю дзяржаву? Ірак сядзіць спакойна і нічога ад нікога не жадае. Спосаб мышлення ва ўсіх дыктатараў падобны: яны не лічацца з жыццём людзей, для іх мэта апраўдвае сродкі дзеяння. Калі б Гусейн быў пэўны, што ён даб’ецца таго, чаго хоча, ён бы гэта зрабіў. Але Гусейна ўжо правучылі ў Іране і Кувейце і цяпер ён ведае, што нічога больш не дасягне.

А ЗША не таму хочуць заняць Ірак, што ён пагражае амерыканцам. Па-першае, гэтага хоча яўрэйскае лобі, бо Гусейн фінансава памагае палесцінцам. Па-другое, амерыканцы хочуць авалодаць другімі па велічыні на Арабскім паўвостраве залежамі нафты. Прыгадаю яшчэ, што зброю, якую Буш хоча ліквідаваць у Іраку, Гусейну далі ЗША ў час вайны з Іранам.

Дзмітры Шатыловіч

Ад аўтара „Азіяцкага аспекту”: Эрудыцыю спадара Капчука ва ўнутрыамерыканскіх справах варта крышку дапоўніць: паўднёвыя штаты ў 1861 годзе сапраўды збунтаваліся — супраць адмены ў іх рабаўладальніцтва.

Імпазантны юбілей (з’ехалася каля мільёна чалавек) бітвы на Косавым Полі ў палове 1989 года стаў выдатнай нагодай для дзелавога пасеву ветру.

Фон Браўн забраў у ЗША нямецкую ракетную дакументацыю, але і саветы не горш скарысталі: у іх рукі трапілі вытворчыя лініі нямецкіх балістычных ракет на ўсходзе Гарцкіх гор, а з імі і шмат навукова-тэхнічнага персаналу.

Гусейн пагражаў перш за ўсё Ізраілю. Калі не чапаць першага, тады нешта трэба зрабіць з апошнім...

У 1938 годзе Германія мела магутную армію, бо з прыходам Гітлера да ўлады яна адкінула Версальскі дагавор з 1919 года і ніхто гэтаму не супрацівіўся, не правучыў, як цяпер Гусейна. Савецкі Саюз у той час шчыра знаёміў немцаў са сваёй танкавай тэхнікай і тактыкай. Калі ўжо Германія ваявала супраць Англіі, Сталін пастаўляў Гітлеру харчы ад „сытых” калгаснікаў і сыравіну; апошні транспарт ад’ехаў 22 чэрвеня 1941 года. Нямецкія падлодкі запраўляліся да таго часу ў Мурманску, дзе ў 1915 годзе англічане збудавалі порт. Таму і напад Германіі на СССР быў вельмі-вельмі вераломны і Сталін на два тыдні зусім разгубіўся. А калі акрыяў, тады загадаў пакідаць таму вераломнаму ворагу спаленую зямлю. А спалена мела быць, галоўным чынам, беларуская зямля: як у час Мікалая II, Аляксандра I ці Аляксея Міхайлавіча — „супляменнікаў і адзінаверцаў”.

Змаганне „свайго” Сталіна з „ворагамі народа” выдатна знізілі баяздольнасць савецкай арміі і яна пацярпела аграмадныя страты ў жывой сіле — нашых супляменніках — і тэхніцы. Савецкім маршалам давялося ваяваць „шапкометанием в три настила”: намагацца „закідаць ворага шапкамі”, пакідаючы ў полі бою па тры насцілы трупаў нашых адзінаверцаў. Агромная страта еўрапейскай тэрыторыі пакінула за савецкім фронтам кволенькі тыл. І невядома, што было б з усходнім фронтам, калі б тыя „благія” амерыканцы і англічане ўжо 1 жніўня 1941 года не пачалі паставак у СССР. Адбываліся яны ў крайне цяжкіх умовах Арктыкі і супрацьдзеяння нямецкага ваеннага флоту з фіёрдаў Нарвегіі. Варта толькі згадаць, што пастаўленая колькасць бранявой сталі (1 450 тыс. тон) і алюмінію (420 тыс. тон) забяспечвала на два гады вытворчую моц саветаў. Саюзнікі паставілі ў СССР м.інш. чвэрць мільёна аўтамашын (напр. на шасі „Студэбэйкераў” устанаўліваліся пускавыя ўстаноўкі „Кацюш”), 7 мільёнаў пар ботаў і 2,6 мільёна тон харчоў: каля 120 кг у год на аднаго салдата. Цікава, як без гэтага выглядалі б, напр., славутыя „десять сталинских ударов” у 1944 годзе. А пра адкрыццё другога фронту намнога лягчэй напісаць чым яго прыгатовіць і паспяхова высадзіць. І не заўсёды ўдавалася дапамагчы вязням канцлагераў, напр. пасля заканчэння вайны сабраныя амерыканскім грамадствам дары вязням Калымы былі расцягнуты лагерным начальствам.

На канец анекдот: Рузвельт паведамляе Сталіну:

— У нас кожны грамадзянін можа бесперашкодна крытыкаваць наш урад.

— І ў нас таксама кожны грамадзянін можа колькі ўлезе крытыкаваць ваш урад, — адказаў „наш” кумір.

Аляксандр Вярбіцкі

Не толькі ў Дубяжыне

Жыхары Дубяжына, Бельскай гміны, нарэкаюць, што вуліца ўначы неасветленая. Ліхтары выключаюцца а дзевятай гадзіне вечара.

— Гэта несправядліва. У суседніх Кошках ці Грэдалях вуліца ўсю ноч асветленая, а ў Дубяжыне „хоць у морду таўчы”, — гаварыў Пятро Ігнацюк. — Да каго з гэтым падацца?

Нядаўна падарожнічаў я раннім цягнікам у Беласток. Мінаючы з боку Кузаву, глядзеў быццам на горад. Ад Чаромхі-Станцыі па віядук на лініі Гайнаўка — Чаромха электралямпы гарэлі. А суседнія Рэпчычы патаналі ў начной цемры. Адно вадасховішча асветленае. Так было і ў Кляшчэлях. Перон станцыі асветлены, горад — у поцемках. У Рыгораўцах, тое ж. Толькі Грэдалі і Кошкі былі асветлены.

У Райску ў вагон зайшоў жыхар Арэхвічаў, што непадалёк Бельска. Калі я пацікавіўся справай вулічнага асвятлення ў іхняй вёсцы, атрымаў ясны адказ: „Бельская гміна мае вялікія даўгі. Таму эканоміць”.

Уладзімір Сідарук

Запрашэнне на рэйд „Анемона”

Аддзел Польскага турыстычна-краязнаўчага таварыства ў Гайнаўцы запрашае 10 мая г.г. на веснавы пешаходны і веласіпедны рэйд „Анемона”.

Веласіпедная траса: Гайнаўка — запаведнік Шчэкатова (тут прадбачваюць раскласці касцёр) — Гайнаўка.

Шлях для пешаходаў: Гайнаўка — запаведнік Ліпіны (тут будзе касцёр) — Гайнаўка.

У рэйдзе можа ўдзельнічаць моладзь ва ўзросце ад 10 да 18 гадоў. Заяўкі трэба падаваць у бюро Аддзела ПТТК у Гайнаўцы, па вуліцы 3 Мая 37, да 8 мая. Дэталёвыя інфармацыі можна атрымаць таксама па тэлефоне: 682-27-85.

Пачатак рэйда а гадзіне 9 перад бюро ПТТК ды заканчэнне і вяртанне ў 14-15 гадзін.

(яц)

Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
Старшыня: Яўген Мірановіч.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Віталь Луба.
Сакратар рэдакцыі: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі”: Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп’ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk”, ul. Składowa 9, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na III kwartał 2003 r. upływa 5 czerwca 2003 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch” na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na III kwartał 2003 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 115,00; pocztą lotniczą Europa — 127,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 153,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 12401053-40060347-2700-401112-005.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,40 zł, a kwartalnie — 44,20 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa”, Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta PBK S.A., I Oddział Białystok, 11101154-401150015504.

Н!ўка

http://www.funny-animal.com/

Калі мы ўзяліся за яйцы [чалавечаскія!?] — малако прапала...

Яйка

„Ab ovo" — лацінскі выраз, які заклікае пачаць спачатку — дослоўна перакладаецца зь *яйка*.

Яйка можа быць качынае, індычынае, перапялінае ці стравусінае, але беларускае *яйка* перадусім — курынае. Вось чаму, асаджаючы наравістага маладзёна, старэйшы скажа: „*Яйка* курыцу вучыць..."

А яшчэ *яйкі* бываюць велікодныя. Расфарбаваныя ў розныя колеры, іх качаюць на ручніку і б'юцца — чыё крапчэйшае?

Яйкі займаюць адно зь першых месцаў у рацыёне беларуса. Іх п'юць сырымі, вараць, смажаць, іх дадаюць у безьліч страваў.

Зь недалёкае гісторыі мінулае вайны кожны з нас ведае словы акупанта, што ўвальваецца ў вясковую хату:

— Матка, *яйка*, — патрабуе ён, пагражаючы аўтаматам.

Не разумею толькі, чаму гэтыя зусім беларускія словы прыпісваюць немцам. Прынамсі, не яны гэта прыдумалі. А ў каго навучыліся? Хто цяпер ведае, можа ў паліцаяў, а можа і ў савецкіх партызанаў.

Расейскае „яйцы" беларускае вуха ўспрымае як лаянкавае слова, што абазначае мужчынскія геніталіі. Вось чаму так сьмешна было чуць з вуснаў Лукашэнкі, які абураўся дэфіцытам то яек, то малака: „Калі мы ўзяліся за яйцы — малако прапала".

На Каляды абавязкова пакладзіце ў мех калядоўнікам тры *яйкі* — сымбаль новага тысячагодзьдзя.

Сяргей Дубавец
(паводле часопіса „ARCHE", 7/2000)

Адгаданка

1	2	3	4	5	6	7
8	9	10	11	12	13	14
15	16	17	18	19	20	21
22	23	24	25	26	27	28
29	30	31	32	33	34	35

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клетці роспісу, складуць рашэнне — афарызм.

1. гнуткая доўгая палка, да якой прымацавана лёска з кручком
= 24 __ 7 __ 32 __ 22 __;
2. зімовае верхняе адзенне з футра
= 8 __ 17 __ 18 __ 15 __;
3. злакавая расліна, зерне якой ідзе на выпечку хлеба
= 14 __ 9 __ 6 __ 30 __;
4. вялікая драпежная неядавітая змяя трапічных і субтрапічных краін, напр. пітон або анаконда
= 35 __ 20 __ 33 __ 31 __;
5. руская мера вагі, роўная 16,38 кілаграма
= 12 __ 5 __ 10 __;
6. псаломшчык
= 23 __ 27 __ 19 __ 3 __;
7. Кіеўская, Чорная або Белая
= 16 __ 21 __ 2 __ 28 __;
8. жорсткі евангельскі цар Іудзеі
= 1 __ 34 __ 11 __ 29 __;
9. Напалеон, кампазітар і піяніст, народжаны ў Варацэвічах на Піншчыне
= 25 __ 4 __ 26 __ 13 __;

Ш

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Рашэнне адгаданкі з 10 нумара

Катлавіна

Як я стаў бацькам

Усё пачалося ад яйка. Або ад курыцы. Ну, бо што было першае? Або, вось, такое пытанне: ці ў Адама ды Евы быў пупок на жываце? Гэтае пытанне турбавала, напрыклад, мастакоў, якія малявялі выгнанне згаданых з Раю. А я, выгнаны з раю хатняга, хоць і ў хаце быўшы, без мае Агаты дык як і без рук, і без галавы. Бо адкуль такія думкі? Сам навару, сам з'ем, хачу кампаніі — кампанія прыйдзе да мяне дахаты... Адборная, перш за ўсё Коля, Збышка, можа, МакХолад... Ну, і якая каляжанка... Што мяне, саламянага ўдаўца, пашкадуе. Бо і што я там навару! Хоць, папраўдзе, гатаваць як мая Агата ўмее толькі МакХолад, толькі пры нагодзе дык апарожніць мне паўбуфета, нават не заўважу, і так зубы загаворыць, вось, такімі пытаннямі наконт таго яйка ці пупка ды іншых сусветных праблем, што есці мне ўжо ягоныя адмысловыя стравы адхочацца. Або пачне пра тое, як рабіць кулябяку ці галубцы... Ну, у гэты раз не паддамся, сам сабе штосьці на свята выдумаю. Калі не ўдасца, дык куплю ў краме. А тое яйка — нуй ды штука — зварыць ды памаляваць! Што там яму красавацца а мне тым яйкам любавацца — і так яго з'ясі... Але якое свята без яйка... І якое мне яно без мае Агаты!..

Ну, што ж, прыйшлося мне, пакуль што, уключыць камп'ютэр. А як жа ж. Гэта называецца ўжо наркатычны голад. І я, якога не ўзяла ў свой палон ні гарэлка, ні тытунь, ні спорт, ні лішняя цяга да прыгожага полу (Агата!), паддаўся мёртвай вылічальнай тэхніцы! Ды якая яна мёртвая! Пра ўсё ведаеш! Што дзе колькі каштуе, і нават тое заказаць можаш, і атрымаць, з вярчальнага крэсла не злазячы. Абы ўяўленне і, вядома, грошы... Ну, да такое ступені я ўжо не здурэў. Прыкінуў, дзе што колькі каштуе ў беластоцкіх крамах, рашыў, што, усё ж, пайду ў маркет „ABC", бо недалёка, і ўсё нарыхтаванае ў кошычках для такіх саламяных удаўцоў, як я, такая „свянцонка". Вядома, крашанкі сам буду рабіць — да каляровага часопіса для жанчын былі далучаны ў фольгавай торбачцы фарбы для яек. Разам з інструкцыяй, як ажыццяўляць фарбаванне велікодных яек...

Купіў я яйкі ў жанчыны з вялікім кошыкам, што стаяла ля старога базара па вуліцы Бэма. Тут можаце ў аднаго дзядзькі купіць тлустае малако ў бутэльцы *PET*, ды такое добрае, што калі ў той бутэльцы яно пастаіць, дык так смятанай рыльца закупорыцца, што, калі дном уверх паставіць адвінчаную бутэльку, дык і тое малако не пацячэ. Добры выраб ад добрага вытворцы! І яйкі тут кабеты прадаюць харошыя, вялікія, ад, кажуць, чырвоных курэй. Трапляюцца нават з падвойнымі жаўткамі! Купіў я такіх амаль аранжавых яек паўкапы, бо толькі ў яе засталося. Плюс трыццаць першае — гаспадыня дадала мне яшчэ адно, апошняе яйка.

Паклаў я яйкі ў халадзільнік. А адно нейкае цяжкае. Баўтануў — адбаўтанула. Занятае! Такое не зварыш, не спячэш... Выкінуць прыйдзецца. Прыклаў я яйка да вуха — штосьці мне ў сэрцы пікнула: як тут выкідаць баўтун, калі там, мабыць, штосьці жывое на свет просіцца!

Паклаў я яечка пад лямпу — будзем грэць, выседжваць! Што ж зробіш! Калі ўжо так здарылася...

Праз пару гадзін мая Гарэшка залілася брэхам. Пад лямпай хісталася на тоненькіх ножках мокрае птушаня.

Так я стаў бацькам кураняткі.

Вандал Арлянскі

„Даўціпы" *Андрэя Гаўрылюка*

Праграма адкрыцця сельскагаспадарчай выстаўкі:

„11 гадзін: Прыезд рагатай і нерагатай жывёлы; 12 гадзін: Прыбыццё запрошаных гасцей; 13 гадзін: Супольны абед".

* * *

Фатограф на вяселлі:

— Ці магу зрабіць здымак шчаслівай пары: маладой і яе мамі?

* * *

Тры месяцы пасля шлюбу маладая Аня прызнаецца маці:

— У свеце для мяне існуе толькі адзін мужчына!

— Гэта вельмі добра, толькі глядзі, каб твой муж пра гэта не даведаўся.

* * *

— Мамачка, — скардзіцца Аня сваёй маме, — мой муж увесь час абгрызае пазногці.

— Гэтаксама рабіў і твой бацька, але я яго адвучыла.

— Якім чынам?

— Схавала яго зубны пратэз.

* * *

Пасля вяселля дачка пытае сваю маці:

— Што робіш з абедам, калі не смакуе бацьку?

— Пакідаю да вячэры.

* * *

Сям'я выбралася ў заапарк. Спыніліся каля клеткі з ільвамі. Цешча хвалюецца:

— Каб хаця які з гэтых звяроў не вылез з клеткі!

— Не бойцеся, мама, — супакойвае яе зяць, — калі вы з намі, ніводзін з іх не адважыцца.

* * *

— Які падарунак купіў ты цешчы на юбілей?

— Папугая.

— Дзеля чаго ты так зрабіў?

— Уяві, што цяпер маю крыху спакою, бо яны безупынна сварацца.

* * *

— Ці ты чуў, што Андрэй развёўся, а затым ажаніўся з сястрой першай жонкі?

— Відаць не хацеў мець чарговай цешчы.

* * *

Чыноўнік узяў хабар ад бізнесмена, заглянуў у канверт, усміхнуўся ды спытаў:

— Хачу даведацца, хто вам сказаў, што бяру так мала?

* * *

Камісія праводзіла конкурс на пасаду дырэктара. Кожнаму з кандыдатаў паставілі аднолькавае пытанне: „Колькі будзе два і два?"

— Чатыры, — адказаў першы.

— Пяць, — адказаў другі.

— Тры, — адказаў трэці.

— А трэба каб колькі было? — спытаў чацвёрты; і ён стаў дырэктарам.

* * *

— Ці ведаеш, як мой „Малюх" стаў цяпер ціха ездзіць?!

— А што: падрэгуліраваў рухавік?

— Не! Перастаў вазіць цешчу.

ISSN 0546-1960